ІНВЕСТЫЦЫІ Ў КАЛІЙНАЕ РАДОВІШЧА

МС

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАННЯ НА ТЫДЗЕНЬ

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 МАЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 95 (28962)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:
«У Беларусі актыўна рэалізоўваюцца праекты па захаванні і эфектыўным выкарыстанні аб'ектаў Сусветнай культурнай спадчыны, вывучэнні і структураванні архіваў і бібліятэчных калекцый, стварэнні каталогаў і аблічбоўцы ўнікальных друкаваных матэрыялаў. Беларусь прадстаўлена ва ўсіх спісах спадчыны ЮНЕСКА. Мы па праве ганарымся тым, што на тэрыторыі нашай краіны знаходзяцца чатыры аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА: Белавежская пушча, геадэзічная Дуга Струвэ, замкавы комплекс «Мір» і палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы. Гэтыя аб'екты — важкі ўклад краіны ў сусветную скарбніцу. Яны ўяўляюць каласальную цікавасць для даследчыкаў і шырокай грамадскасці».

ПАЭТЫЧНАЕ СЭЛФІ

З наступленнем вясенне-летняга сезона ў Навагрудку, як заўсёды, чакаецца турыстычны бум. Кожны наведвальнік першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, акрамя руін сярэднявечнага замка, касцёлаў і царквы, забудовы рынкавай плошчы, імкнецца ўбачыць «разыначку» горада — Дом-музей Адама Міцкевіча — і зрабіць сэлфі на фоне бюста геніяльнага паэта.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРОТКА

• Стыпендыі спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў будзе атрымліваць 191 чалавек.

• **Беларусь і КНР падпісалі пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі і вучоных ступенях.**

• Інавацыйны беларуска-расійскі ліфт прэзентавалі ў Маскве.

• **Каля чатырох тысяч ваеннаслужачых у складзе пешых парадных разлікаў прымуць удзел у парадзе 3 ліпеня.**

• Стваральнікі валошкавага марожанага шукаюць дзяўчыну, якой падораць мільён блакітных кветак.

ISSN 1990 - 763X

Форум

НА КАРЫСЦЬ ЖУРНАЛІСТЫКІ ПРАЎДЫ

Медыяфорум: клопат пра журналістаў, запатрабаванасць аналітыкі і змаганне за абмежаваны рэсурс

Учора ў Брэсце распачаў работу XIV Беларускі міжнародны медыяфорум. Ён носіць назву «Партнёрства ў імя будучыні: журналістыка і сацыяльная абарона грамадства». Тут вядуцца размовы пра новую рэальнасць медыяпрасторы, пра тое, як канкураваць (і ці патрэбна?) з сацыяльнымі сеткамі, пра якасную журналістыку і інфармацыйны шум. Эксперты не толькі з Беларусі, але і з Украіны, Расіі, Ізраіля, Эстоніі, Таджыкістана, Узбекістана, Туркменістана, Сербіі і іншых краін дзеляцца сваім прафесійным бачаннем.

СТАР. 3

Фота БелТА.

Спецыяльны рэпартаж

«ДА НАРКОТЫКАЎ НЕ ВЯРНУСЯ»

У папраўчай калоніі № 22 адбываюць пакаранні мужчыны, упершыню асуджаныя за незаконны абарот наркотыкаў (артыкул 328 КК Беларусі). Турму пад Івацэвічамі ў народзе называюць «Воўчыя норы» — па вёсцы, якую спалілі падчас вайны. Дарога ва ўстанову ляжыць цераз лес, найбліжэйшыя населеныя пункты — Даманава і Боркі — за 9 кіламетраў. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў калоніі і паглядзелі, як жывуць тыя, хто аднойчы пераступіў закон.

* * *

— Тут я ўжо прыкладна год і сем месяцаў, — знаёмімся з Уладзімірам Стадольнікам.

— Прыкладна?

— У мяне вялікі тэрмін, 12 гадоў, — лічыць па днях бессэнсоўна. Я сам не наркаман і нават ніколі не спрабаваў. У турму трапіў за перавоз кантрабанды. Вага грузу сур'ёзная — 75 кілаграмаў, — згадвае 51-гадовы мужчына. — Амаль тры разы быў жанаты. Апошні проста не паспеў! Планавалі распісацца ў чэрвені, а ў сакавіку мяне «ўзялі».

На пытанне, што падштурхнула парушыць закон, мужчына адказвае неахвотна:

— Раскайваюся. Але навошта зараз шукаць прычыны? Усё роўна нічога не змяніць, — замаўкае. — Матуля і сын — самыя блізкія людзі. Яны не адвярнуліся ад мяне, прабачылі. Падтрымка на зоне патрэбная як паветра.

СТАР. 4

ВЫПАДКОВАСЦЬ? ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ!

Беларусь актывізуе перагаворы па пастаўках нафты з Казахстанам

Пра ўзаемадзеянне Беларусі і Казахстана напярэдадні саміта Еўразійскага эканамічнага саюза ў Нур-Султане і пазачарговых выбараў у Казахстане ішла размова Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла гэтай краіны Ермухамета Ертысбаева.

«Я ўпершыню буду ў сталіцы з новай назвай. А ўвогуле, я вельмі часта бываў у Казахстане, добра ведаю і поўдзень, і цэнтр, і на поўначы мне пашчаслівілася пабываць. Выдатная краіна, якая развіваецца. Няпростыя працэсы адбываюцца ў палітычнай галіне — зразумела, прэзідэнцкія выбары, асабліва змена прэзідэнта. Гэта заўсёды пэўным чынам адлюстроўваецца на жыцці, грамадстве. Ды што там казаць — нават на эканоміку ўплывае», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Па словах лідара дзяржавы, у плане гандлю ў краін праблем няма. Праўда, станоўчае сальда ў тавараабароце ў Беларусі. «Але вы павінны ведаць, што ў Казахстане ствараюць масу тавараў, якія нам вельмі патрэбныя: пачынаючы ад бавоўны і заканчваючы металамі», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка і акрэсліў новыя напрамкі для сумеснага гандлю.

Беларусь гатова купляць у Казахстане збожжа. Яго ў гэтай краіне лішкі дзякуючы высокай ураджайнасці і вялікай колькасці пасяўных плошчаў цвёрдых сартоў пшаніцы. Таму праблема дысбалансу ў гандлі — толькі пытанне часу. Яго рашэнне Прэзідэнт даручыў міжурадавай камісіі дзвюх краін.

Пакуль сустаршыня гэтага органа з казахстанскага боку адсутнічае — былы, Аскар Мамін, заняў пасаду прэм'ер-міністра. «Гэта таксама для нас добра. Чалавек, які ведае добра праблематыку Беларусі, стаў прэм'ер-міністрам Казахстана. Гэта, шчыра кажучы, нас вельмі задавальняе»,— пракаментаваў беларускі лідар.

Справа тут, па словах Прэзідэнта, не ў персаналіях — у краін заўсёды былі добрыя сувязі, лідары выбудавалі дакладную сістэму ўзаемаадносін. Патэнцыял развіцця супрацоўніцтва маштабны, садзейнічае яму і ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях».

«У вас усходнія воты, у нас «Вялікі камень», свабодныя эканамічныя зоны. Я думаю, тут большае спалучэнне павінна быць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуў ён увагу і на тое, што Беларусь дыверсіфікуе пастаўкі вуглевадародаў сыравіны. «Мы маем некалькі пунктаў судакранання і вядзём перагаворы пра пастаўку нафты ў Беларусь з іншых крыніц. У гэтым годзе мы ў асноўным скончым мадэрнізацыю нафтаперапрацоўчых заводаў. Нам будзе крыху лягчэй набываць на сусветных рынках нафту. У сувязі з гэтым мы ўжо вядзём перагаворы і хочам, каб яны (па пастаўках казахстанскай нафты ў Беларусь) былі актывізаваныя», — адзначыў Прэзідэнт.

Пытанне транзіту «чорнага золата» датычыцца не толькі дзвюх краін, але і Расіі. «Расія — член ЕАЭС. Думаю, што з блізкай нам краінай мы зможам дамовіцца аб пэўных аб'ёмах пастаўкі нафты з Казахстана», — упэўнены беларускі лідар.

На палях юбілейнага саміта ў Нур-Султане Прэзідэнт плануе абмеркаваць двухбаковыя адносіны краін са сваімі дзеючым і былым калегамі.

Пасол Ермухамет Ертысбаеў у размове з журналістамі таксама адзначыў праблему адмоўнага сальда Казахстана, пра якую казаў Аляксандр Лукашэнка. Выправіць гэтую сітуацыю плануюць да восені, калі адбудзецца афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Казахстан.

Казахстанскі бок гатовы пастаўляць нафту ў Беларусь. Учора гэту тэму з галіновымі ведамствамі абмяркоўваў беларускі пасол у Казахстане Анатоль Нічкасаў. «Паміж намі ляжыць Расія. Яна з'яўляецца важным партнёрам і для Беларусі, і для Казахстана. Гэта наш галоўны стратэгічны партнёр. Таму гэта прадмет перамоўнага працэсу, я думаю, мы пастараемся знайсці агульнадапушчальнае. Канешне, для Расіі гэта будзе нявыгадна. У іх сваёй нафты дастаткова. Але мы хацелі б, каб Еўразійскі эканамічны саюз быў выгадны для ўсіх удзельнікаў. І на этапе станаўлення нашага саюза вельмі важна падтрымліваць усіх, — адзначыў пасол. — У нас адна праблема — як запусціць нафту ў трубу. Там чарга ёсць, груба кажучы. Канешне, мы можам чыгуначнымі саставамі пастаўляць і гэтак далей. Але эфектыўнасць некалькі іншая будзе».

Новае кіраўніцтва Казахстана разгледзіць пытанне і набыцця пакета акцый «Гомсельмаша», каб наладзіць вытворчасць беларускай сельгастэхнікі.

Марыя ДАДАЛКА.

Парламенцкі дзённік

Паслабленне не будзе

Дэпутаты падтрымалі дэкрэт аб дадатковых мерах па барацьбе з карупцыяй

Дакумент прадставіў генеральны пракурор Беларусі Аляксандр Канюк падчас чарговага пасяджэння шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Усяго ўчора ў Авальнай зале ніжняй палаты было разгледжана 13 пытанняў.

Мэта дэкрэта — узмацненне мер адказнасці за карупцыйныя злачынствы. Нагадаем галоўнае з дакумента: асобы, асуджаныя за здзяйсненне карупцыйных злачынстваў, не падлягаюць прадстаўленню да ўмоўна-датэрміновага вызвалення або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім.

Красамоўна сітуацыю з карупцыяй у краіне апісваюць лічбы: кожны год фіксуецца каля дзвюх тысяч такіх злачынстваў, да адказнасці прыцягваюцца каля тысячы службовых асоб. У 2018 годзе колькасць карупцыйных дзеянняў павялічылася на трэць.

Пазней Аляксандр Канюк расказаў журналістам, што яго ведамства ўнесла прапанову публікаваць у адкрытым доступе дэкларацыі аб даходах і маёмасці чыноўнікаў. Ён нагадаў пра словы Аляксандра Лукашэнкі аб тым, што людзі павінны ведаць пра чыноўнікаў: што ў іх ёсць, за што яны жывуць, якія ў іх будынкі і машыны.

На чыноўнікаў якога ўзроўню можа распаўсюдзіцца такая практыка? На думку генпракурора, гэта асобы, якія займаюць дзяржаўныя пасады, супрацоўнікі выканкамаў розных узроўняў, міністры, работнікі міліцыі, пракуроры, суддзі.

Пры гэтым генеральны пракурор зрабіў важнае ўдакладненне: заўсёды трэба памятаць аб этычных нормах. Калі і публікаваць дэкларацыі ў адкрытым доступе, то без персанальных даных. У іншым выпадку адбываюцца сітуацыі, калі літаральна паведамляецца акно кватэры, дзе жыве сын ці маці чалавека.

Іншымі словамі, можна паведаміць цану кватэры, але адрас называць нельга.

Дарэчы, а ці гатовы сам Аляксандр Канюк агучыць такую інфармацыю? Напрыклад, на чым ездзіць генеральны пракурор Беларусі?

«У мяне KIA Sorento 2011 года. Ёй восем гадоў, нармальная машына, мне падабаецца», — сказаў ён.

Яшчэ ёсць прапанова выкарыстоўваць дэтэктар хлусні пры прыёме на працу дзяржслужачых. Такую праверку, паводле слоў Аляксандра Канюка, павінны праходзіць праваахоўнікі, дзяржслужачыя, якія ўваходзяць у кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы. У асобных ведамствах гэта ўжо выкарыстоўваецца: напрыклад, у ДАІ.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

У ЛЕС ЦІ ПА ДРОВЫ?

Прэзідэнт дазволіў экспарт лесу-кругляку, але запатрабаваў паскорыць будаўніцтва пелетных заводаў

Апошнім часам нараканняў наконт працы з ляснымі рэсурсамі зашмат, і адказным за лясную гаспадарку трэба сур'ёзна падключыцца да гэтага пытання, разабрацца і вызначыцца з адпаведным міністэрствам, як жыць далей. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам па павышэнні эфектыўнасці выкарыстоўвання лясных рэсурсаў старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Леаніда Анфімава і намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Дворніка.

«Гэта падарунак прыроды, але мы ставімся да лесу абы-як. Я часта бываю ў лесе і гляджу, як працуюць нашы леснікі. Ні па пасадках, ні своечасова спілаваць спелы лес для перапрацоўкі, ні дарог... Карацей, мала парадку. Проста бязладна ставімся да гэтага падарунка, найвялікшага. Не кажучы ўжо пра эканоміку: амаль 40 % тэрыторыі — лес. Трэба скарыстацца гэтым рэсурсам. Гэта добрая сыравіна. Напілавалі лесу і не можаце яго перапрацаваць, просіце дазволу на пастаўкі бярвёнаў на знешні рынак. А мы калісьці ўжо дамовіліся, што павінны перапрацоўваць нашы лясныя рэсурсы ў нейкі паўфабрыкат, а лепей — у мэблю (з высокай дабаўленай вартасцю перапрацоўваць сыравіну), і пастаўляць на знешнія рынкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Забарона на экспарт лесу-кругляку летась была вытрымана. Аднак сёлета, як патлумачыў журналістам Леанід Анфімаў, праз збег шматлікіх негатыўных фактараў і для лясной гаспадаркі, і для дрэваапрацоўкі, здарылася разбалансіроўка аб'ёмаў нарыхтоўкі драўнянай сыравіны і яе перапрацоўкі на ўнутраных вытворчых магутнасцях. Каля трох мільёнаў кубаметраў драўніны аказалася неперапрацаванай і патрабуе неадкладных рашэнняў па рэалізацыі.

«Асноўныя перапрацоўшчыкі могуць павялічыць перапрацоўку тэхнічна і тэхналагічна, але прадукцыя будзе незапатрабаваная. Таму Міністэрства лясной гаспадаркі і Савет Міністраў звярнуліся да Прэзідэнта з просьбай даць дазвол на экспарт 900 тысяч кубаметраў драўніны. Частку астатняй драўніны перапрацуем унутры краіны і экспартуем прадукцыю з больш высокай дабаўленай вартасцю, частку нарыхтуем на дровы для сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — паведаміў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Прэзідэнт падтрымаў ініцыятыву, але абазначыў задачы на найбліжэйшую перспектыву, да 2020 года.

Драўніну можна было б перапрацоўваць на паліўныя пелеты, калі б былі створаныя неабходныя магутнасці. У прыклад Леанід Анфімаў прывёў завод у Пастаўскім мэблевым цэнтры праектнай магутнасцю каля 30 тысяч тон пелетаў у год. У планах вытворцаў — выйсці на 37 тысяч тон. Цана склалася каля 95 еўра за тону пелетаў.

Кіраўнік краіны адзначыў, што на біяпаліва вялікі попыт і добры кошт. «Дык ужо ўчора трэба было завезці абсталяванне... Шэсць машын не можам паставіць! Дах зрабілі — і працуйце, а паралельна рабіце сцены. Таму калі ў вас з'яўляюцца лішкі, якія не можаце перапрацаваць на існуючых прадпрыемствах, хутчэй рэалізоўвайце праекты па будаўніцтве ў кожнай вобласці гэтых заводаў», — патрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Шэсць заводаў, аналагічных пастаўскаму, на думку старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, могуць пачаць працаваць ужо праз год. Адзінаццаць вытворчасцяў сістэмы Міністэрства лясной гаспадаркі, што існуюць сёння, Леанід Анфімаў лічыць больш не прамысловымі, а кустарнымі: тут вырабляецца 20 тысяч тон пелетаў у год.

Па інфармацыі Леаніда Анфімава, практычна ў кожным з 98 лясгасаў працуюць лесаперапрацоўчая вытворчасць, лесапілаванне. На пелеты ж ідуць адходы, і каб хоць бы ў большай частцы былі маленькія вытворчасці па выпуску біяпаліва, праблемы з лішкамі тэхналагічнай і дрывяной драўніны не засталося б.

Варвара МАРОЗАВА.

Міжэтнічны мір — безумоўны прыярытэт

Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава ўчора ў Магілёве сустрэлася з прадстаўнікамі мясцовай цыганскай дыяспары, паведамляе БелТА.

Нагадай для размовы сталі скаргі, агучаныя ў сродках масавай інфармацыі, на парушэнні падчас праверачных мерапрыемстваў па факце гібелі інспектара ДПС Яўгена Патаповіча. Тых, хто звяртаўся, Прэзідэнт пачуў, накіраваўшы свайго прадстаўніка для грунтоўнай гутаркі.

Наталля Качанава за сітуацыю, якая адбылася, прадстаўнікам мясцовай дыяспары прынесла прабачэнні, калі сапраўды падчас расследавання абставінаў справы мелі месца факты некарэктных дзеянняў. Таксама кіраўнік Адміністрацыі акцэнтавала ўвагу, што па ўсіх скаргах і зваротах будуць праведзены разборы, і асабліва адзначыла, што міжэтнічны мір і згода ў нашай краіне з'яўляюцца безумоўным прыярытэтам.

УЛАДА ВЫХОДЗІЦЬ НА СУВЯЗЬ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу, 25 мая. На званкі з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221-31-21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222-22-22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233-12-37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273-56-44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Васіль Іванавіч АКУЛІЧ. Тэл. 8 022 250-18-69;

старшыня МІНСКАГА аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 500-41-60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 222-44-44

НА КАРЫСЦЬ ЖУРНАЛІСТЫКІ ПРАЎДЫ

Чытацкі выбар на карысць праўды

На адкрыцці мерапрыемства **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** зачытаў прывітальнае слова Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам медыяфоруму: «Сімвалічна, што ў год 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў месцам правядзення форуму выбраны Брэст — горад-герой, які мужна прыняў на сябе першыя ўдары ворага. Нашы народы здзейснілі вялікі подзвіг, адстаялі ў той вайне сваю свабоду і незалежнасць, таму што былі разам. Сёння мы таксама сумесна павінны зберагчы агульную гісторыю, не дапусціць перагляду і фальсіфікацыі гераічнага мінулага. Зрабіць не толькі прафесійны, але і глядацкі, чытацкі выбар на карысць журналістыкі праўды, справядлівасці і аб'ектыўнасці».

У сваю чаргу **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** заўважыў:

— Мы сабраліся на медыяфоруме для размовы аб прафесіі і аб тым, як зрабіць, каб нам верыў наш чытач, каб ён адкрываў новае праз медыйныя рэсурсы. Упэўнены: кожнаму з прысутных ёсць што сказаць: тут сабраліся спецыялісты з розных рэгіёнаў. Будзем абмяркоўваць розныя тэмы: інфармацыйную прастору, медыябяспеку, сучасныя трэнды інтэрнэт-журналістыкі.

СМІ — больш не манапаліст

Аб сённяшняй ролі СМІ ў грамадстве **намеснік міністра лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі Аляксей ВОЛІН** выказаўся так:

— СМІ могуць быць адказнымі толькі ў тым выпадку, калі з'яўляюцца ўплывовымі і маюць сваю аўдыторыю. Гэта звязана з шэрагам фактараў. Першы — мы ўсе змагаемся за абмежаваны рэсурс. Бо ў чалавека толькі 24 гадзіны ў сутках. Ён можа патраціць іх на сон, на працу. А мы, па сутнасці, змагаемся за яго вольны час. Прычым барацьба адбываецца і паміж СМІ, і паміж сацсеткамі. Тут жа канкуруруе і час на прагляд фільмаў, серыялаў. Калі 20—30 гадоў таму ў СМІ была манаполія на інфармацыю, чытачы выстройваліся ў чаргу каля газетных кіёскаў, то сёння сітуацыя змянілася. Мы маем вельмі «перакормленага» спажыўца, якому ёсць з чаго выбраць. Ён стаў не толькі пераборлівым, але і капрызным. Гэта прыводзіць да таго, што тыя стаўпы, якія былі лідарамі рынку і засяроджвалі львіную долю аўдыторыі, сёння яе губляюць. Яны вымушаны нарошчваць расходы, каб утрымаць спажыўца. Ніводная газета сёння не можа існаваць без інтэрнэт-версіі. Аднак усе размовы пра тое, што папера сыдзе ў нікуды, няслушныя. Праўда, памылку дапускаюць і тыя, хто робіць аднолькавую тэкставую і інтэрнэт-версію. Чытаючы інтэрнэт-варыянт, чалавек можа адмовіцца ад папяровага выдання. Сайт павінен быць зроблены па прыкладзе стужкі. А ў газеце — змяшчаць больш аналітыкі...

Генетычна разумныя людзі

Галоўны рэдактар партала Tribuna.ee Дзяніс РАДЗІВОНАЎ (Эстонія) расказаў:

— Нам важна паглядзець, як СМІ ўзаемадзейнічаюць з грамадствам і як грамадства ўзаемадзейнічае са СМІ. Цяпер праўда ў кожнага свая. Вялікую ролю адыгрываюць сацыяльныя сеткі. Чым болей у цябе падпісчыкаў — калі болей за тысячу ці дзесяць тысяч, — ты ўжо робішся лідарам меркаванняў. Тое ж і з друкаванымі выданнямі. У невялікай краіне і некалькі тысяч асобнікаў аднаго выдання мае істотны ўплыў. Сёння няма вялікага толку перадрукоўваць навіны, хіба што вельмі дазіравана. Людзі звяртаюцца да традыцыйных сродкаў масавай інфармацыі па аналітыку. На форуме хачу пагаварыць і пра падачу інфармацыі ў тых краінах, дзе ёсць некалькі моўных груп. Ім усім трэба даваць пляцоўкі для выказвання. Інакш гэта грамада будзе дэградаваць.

Генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Трэнд» (Азербайджан) Ільгар ГУСЕЙНАЎ адзначыў:

— Я ўпэўнены, што ў прафесію журналіста павінны прыходзіць людзі генетычна разумныя. Асобы не проста адукаваныя, але інтэлектуалы. Супрацьстаяць жоўтай прэсе можа толькі цэлая каманда дасведчаных журналістаў.

Дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Армэнпрэс» Арам АНАНЯН выказаў меркаванне:

— Журналістыка больш не з'яўляецца гуманітарнай прафесіяй. Гэта сінтэз антрапалагічнай навукі, пісьма і прадугадвання будучыні. Медыяфорум называецца «Партнёрства ў імя будучыні» — мы ўсе спрабуем угадаць, што нас чакае. Не толькі мы павінны абараняць соцыум. Але і соцыум павінен абараняць сваіх журналістаў. Бо калі мы, журналісты, не будзем адчуваць запатрабаванасці, будучыні не будзе. Мы павінны засвоіць новую парадыгму заўтрашняга дня. У сучасным свеце вялікі попыт на простыя ідэалогіі. Яны лёгка ўваходзяць у розум і не патрабуюць пытанняў. Яны спрашчаюць усё. Яны былі і ў мінулым ды ставілі на чале не чалавека, а вар'яцкія ідэі. Гэта і прывяло да таго, што нашым продкам давялося знішчаць гэтую ідэалогію...

Намеснік дырэктара інфармацыйнага агенцтва «Украінскія навіны» Аляксандр ХАРОЛЬСКІ адзначыў:

— Мы абмяркоўваем тэму сацыяльнай абароны грамадства. Ва Украіне ёсць два непараскальныя паміж сабой светы. Адзін не разважае пра журналісцкія каштоўнасці (жыве часцей за ўсё на гранты) і ні на што не ўплывае. Другі — гэта менеджары, рэдактары, журналісты, якія жывуць ва ўмовах рынку. Назіраецца такі парадокс: чым глыбей у рынак, тым менш сацыяльных пытанняў вырашаецца. Часцей асвятляюцца змены ў «Фэйсбуку», пэўныя новыя трэнды. Сацыяльныя праблемы адыходзяць на другі план. Мяняецца і мысленне людзей — да фрагментарнага, кліпавага. Галоўныя рэдактары кажуць, што вельмі складана навучыць маладога спецыяліста напісаць паўнавартасны, удумлівы матэрыял. Яны мысляць іначай. Навокал інфармацыйны шум, кліпінг... У той жа час з'яўляюцца тыя, хто гатовы плаціць за фільтры ад гэтага шуму. Таму вяртанне да СМІ нават ва ўмовах рынку непазбежнае.

Сёння, у другі дзень форуму, будзе працаваць Летняя школа журналістыкі, пройдзе круглы стол, прысвечаны медыяпрастору Саюзнай дзяржавы, удзельнікі форуму наведаюць Брэсцкую крэпасць.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Зяленскі пацярпеў першае паражэнне ў парламенце

Вярхоўная рада Украіны адмовілася ўносіць у парадак дня прапанаваныя прэзідэнтам Уладзімірам Зяленскім папраўкі ў закон аб выбарах у парламент. Зяленскі хацеў адмовіцца ад аднамандатнікаў і цалкам перайсці на партыйныя спісы.

Новы прэзідэнт Украіны прапанаваў дэпутатам адмяніць мажарытарны складнік цяперашняй выбарчай сістэмы, а таксама знізіць прахадны бар'ер для партый — удзельніц выбараў з 5 % да 3 %.

Ініцыятывы Зяленскага былі раскрытыкаваныя дэпутатамі: яго прапановы назвалі «карупцыйнай схемай», прэзідэнта абвінавацілі ў спробе ўзурпацыі ўлады.

У выніку за ўключэнне законапраектаў Зяленскага ў парадак дня прагаласавалі ўсяго 92 дэпутаты пры неабходным мінімуме ў 226 галасоў.

Намеснік кіраўніка МЗС РФ: Паўднёва-Усходняя Азія і Еўропа могуць апынуцца пад ударам тэрарыстаў

Чарговымі мішэнямі тэрарыстаў могуць стаць краіны Паўднёва-Усходняй Азіі і Еўропы. Такое меркаванне ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС выказаў намеснік міністра замежных спраў Расіі па пытаннях працідзеяння тэрарызму Алег Сырамалотаў.

«У Еўропу з міграцыйным патокам пранікла мноства тэрарыстаў, — растлумачыў высокапастаўлены дыпламат. — Яны ўжо ўстанавілі сувязі з арганізаванай злачыннасцю. Там пакуль усё гэта тлее, але можа стрэліць вельмі моцна».

Закранаўшы сітуацыю ў Паўднёва-Усходняй Азіі, намеснік кіраўніка МЗС РФ выказаў меркаванне, што ў гэтым рэгіёне пад ударам могуць апынуцца ў першую чаргу дастаткова бедныя краіны з унутраным канфліктным патэнцыялам і недасканалым заканадаўствам.

Эксперт: аднаўляльная энергетыка неабходная незалежна ад прычын змены клімату

Як адзначыў акадэмік РАН Сяргей Аляксеенка, можна вылучыць агульныя тэндэнцыі развіцця такой энергетыкі як у свеце, так і для асобных дзяржаў у прыватнасці. Важнасць развіцця аднаўляльнай энергетыкі часта абгрунтоўваецца неабходнасцю зніжэння антрапагенных выкідаў CO_2, якія прыводзяць, паводле гэтай гіпотэзы, да глабальнага пацяплення.

Самы перспектыўны від аднаўляльных крыніц энергіі, на яго погляд, гэта геатэрмальная энергетыка, а дакладней, петратэрмальная (выкарыстанне цяпла сухіх парод Зямлі на глыбінях ад 3 да 10 км). Тэмпература на такіх глыбінях дасягае 350 °С. Акадэмік упэўнены, што запасаў глыбіннага цяпла хопіць на 50 000 гадоў.

Надвор'е

ДАЖДЖЫ ІДУЦЬ З ЗАХАДУ

На гэтым тыдні ў нашай краіне стаяла па-летняму цёплае надвор'е. Тэмпературны фон за першую палову тыдня на 3—7 градусаў перавысіў кліматычную норму. Але не ўсё кату ў смятане купацца — ужо ў наступныя дні надвор'е пачне мяняцца, і ў другой палове пятніцы тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальнага падзелу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу атмасферны фронт перамесціцца на паўднёвы ўсход краіны, і ўслед за ім пачне паступаць больш халоднае паветра. Таму ў гэты дзень месцамі па краіне, а днём па Гомельскай і Магілёўскай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 градусаў вышэй за нуль, па паўночным захадзе краіны — 8—9 цяпла. Удзень будзе ад плюс 17 да плюс 24 градусаў.

Уначы на нядзелю надвор'е супакоіцца, будзе пераважна без ападкаў. Удзень пад уплывам малаактыўнага фронту месцамі, у асноўным па заходняй частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да плюс 11 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны — да 12—13 цяпла. Тэмпература знізіцца і днём, калі будзе ад плюс 15 па паўночным захадзе да 23 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень па краіне будзе ад плюс 15 да 22 градусаў цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Хакей

Пазмагацца за права на Алімпіяду

Сталі вядомыя першыя сапернікі беларусаў

Наша зборная цяпер займае 14-е месца ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF). У актыве беларускай каманды 2735 ачкоў пасля праведзенага ў першым дывізіёне чэмпіянату свету ў Нур-Султане. Як адзначылі ў Федэрацыі хакея Беларусі, на чэмпіянаце свету — 2020, які пройдзе ў Швейцарыі, наша зборная можа згуляць у адной групе з камандамі Славакіі, Даніі і Вялікабрытаніі. А рэйтынг вядучых зборных будзе вызначаны пасля завяршэння сёлетняга чэмпіянату свету ў элітным дывізіёне, які праходзіць у Славакіі.

Таксама стала вядома, што за права згуляць на 24-х зімовых Алімпійскіх гульнях у Пекіне нацыянальная зборная Беларусі паспрачаецца з камандамі Славакіі і Аўстрыі. Яшчэ адзін сапернік нашых хакеістаў вызначыцца па выніках перадкваліфікацыйных турніраў, якія будуць згуляныя зімой наступнага года. Беларусам, славакам і аўстрыйцам дастанецца каманда з ніжэйшым рэйтынгам у зводнай табліцы IIHF з ліку пераможцаў падгруп на папярэднім раўндзе кваліфікацыі. Таксама вядома, што спаборніцтвы ў нашай чацвёрцы прыме Славакія. Матчы фінальнай алімпійскай кваліфікацыі будуць згуляныя ў канцы лета 2020 года.

Нагадаем, што зімовыя Алімпійскія гульні пройдуць з 4 да 22 лютага 2022 года ў Пекіне. У хакейным турніры возьмуць удзел 12 каманд: восем зборных, якія размяшчаюцца на 1—8-м месцах у рэйтынгу IIHF, Кітай як краіна — гаспадыня спаборніцтваў, а таксама тры пераможцы фінальных кваліфікацыйных турніраў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

«ДА НАРКОТЫКАЎ НЕ ВЯРНУСЯ»

Варкаўт-пляцоўка ў справе.
Сваё майстэрства асуджаным дэманструюць навучэнцы грамадскага аб'яднання «Федэрацыя «Street workout».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тэлефанаваць сваякам можна тры-чатыры разы на месяц. Уладзімір часцей за ўсё звязваецца з 76-гадовай матуляй: «У яе ўзросце кожны званок каштоўны». Ён загадзя прадумвае, пра што будзе расказваць і пытаць, каб усё паспець. Раз на паўгода асуджаным дазволеныя працяглыя спатканні з роднымі, тры разы — кароткатэрміновыя.

Тыя, хто адбывае пакаранне ў калоніі, працуюць на дрэваапрацоўцы, разборцы металу і кабеляў. «Тут розуму шмат не трэба — проста круці гайкі», — лічыць асуджаны. Сам ён па адукацыі юрыст, але па спецыяльнасці, прызнаецца, амаль не рабіў: «У 90-я гады такія паслугі мала каму былі патрэбныя». Мужчына займаўся грузаперавозкамі.

Зараз у калоніі № 22 адбываюць пакаранне крыху больш за тысячу асуджаных. Адзін з іх — 29-гадовы **Мікіта Сарскоў** з Мар'інай Горкі. Хлопцу далі дзесяць гадоў пазбаўлення волі, тры з паловай ён ужо адбыў:

— Я курыў марыхуану. Гэта было даступна ў нашым горадзе. Не з той кампаніяй звязаўся. Віну прызнаў яшчэ на судзе. Вы нават не ўяўляеце, як шкада губляць тут час!

Распарадак дня ў асуджаных просты, але строгі. Пад'ём у шэсць гадзін раніцы, адбой — у 22.00. Харчаванне — тры разы на дзень. Гатуюць яны самі, таму, як жартуюць суразмоўцы, «на кухні ніхто не схалтурыць».



Царква на тэрыторыі калоніі.

Працоўны тыдзень складаецца з пяці дзён. У суботу і нядзелю, святочныя дні — выхадныя. Рабочыя атрымліваюць зарплату. Частка грошай ідзе на пакрыццё дзяржвыдаткаў і выплату іскаў, калі яны ёсць. Рэшта адпраўляецца на рахунак асуджанага — выкарыстае, калі вызваліцца.

— Я ніякай працы не баюся. Па жыме штангі моладзі фору магу даць! — хваліцца Уладзімір. — Не палю і хлопцам раю. Спортам на аматарскім узроўні займаюся ўсё жыццё. На волі разоў пяць на тыдзень хадзіў у спартыўную залу. Першая жонка маладзейшая за мяне на 12 гадоў, другая — на 11. Мужчына заўсёды павінен быць у добрай фізічнай форме!

* * *

— Першы час каханая дзяўчына прыязджала да мяне на спатканні, перапісваліся. А потым я папрасіў, каб яна ўладкоўвала сваё жыццё без мяне. Не хацеў уцягваць яе ва ўсё гэта, яна вартая большага! — дзеліцца асуджаны.

Мікіта працуе на прамзоне: косіць траву. Участкі вялікія, таму ёсць чым заняцца кожны дзень. Хлопец уладкаваўся сюды нядаўна, да гэтага нарыхтоўваў дровы для кацельні.

— Я скончыў чатыры курсы Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, вучыўся на эканаміста. У мяне была нядрэнная паспяховасць, сярэдні бал 7—8, — расказвае Мікіта. — Выдатна ведаю англійскую мову. Працягваю вывучаць яе і ў турме па падручніках. Люблю хадзіць у мясцовую бібліятэку.

Што датычыцца адукацыі, то ў калоніі яе можна атрымаць дыстанцыйна. Прапануецца навучанне ў прафесійным ліцэі па спецыяльнасцях сталяр-станочнік, швачка-кравец, газаэлектразваршчык, а таксама ў Мінскім інавацыйным універсітэце. Зараз там лічацца больш за 30 студэнтаў.

На тэрыторыі калоніі пабудаваная царква, куды кожны тыдзень прыязджае святар. Ва ўзвядзенні храма ўдзельнічалі самі асуджаныя. Яны могуць павянчацца там са сваімі жонкамі. Праўда, адбываецца гэта нячаста — раз-два на год.

— З жонкай скасавалі шлюб, калі трапіў у турму. Вырашылі, што так будзе лепей для абаіх. Ведаеце, мне больш шкада сваякоў, чым сябе. Мая правіна прынесла ім шмат слёз. Так не павінна быць, — лічыць хлопец.

Яўген любіць вазіцца з камп'ютарамі. Як выйдзе, думае зрабіць хобі асноўным заняткам: «Трэнерам мяне наўрад ці з такім мінулым куды-небудзь возьмуць. Таму трэба шукаць альтэрнатыву. Але адно ведаю добра — да наркотыкаў не вярнуся».

Днямі ў калоніі адкрылі «спартыўны гарадок». У ім ёсць баскетбольныя і валейбольная пляцоўкі, футбольнае поле, хакейная скрыня, вулічныя трэнажоры і турнікі для заняткаў варкаўтам.

— Мы лічым, што гэтая пляцоўка будзе запатрабаваная ў асуджаных. Спорт для іх — магчымасць адчуць сябе чалавекам, які не імкнецца да крымінальных інтарэсаў, а прытрымліваецца здаровага ладу жыцця і мае захапленні. Трэніравацца можна будзе ў вольны ад працы і вучобы час, — адзначыў **намеснік начальніка Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі Уладзіслаў МАНДРЫК**.

* * *

Падчас размовы з рук выпаў аловак, разляцеўся грыфель: «Зламаны аловак — не бяда. Галоўнае — не зламаць сабе жыццё», — падмеціў адзін з асуджаных.

Урачыстае адкрыццё спартыўнага комплексу.

— На волі працаваў у краме спартыўнага харчавання, нядрэнна разбіраюся ў гэтай тэме, — працягваем тэму захапленняў. — Увогуле спорт люблю. Займаюся ўсім, чым можна, — футбол, валейбол, баскетбол, цяжкая атлетыка.

Пра планы на будучыню пасля вызвалення Мікіта кажа ахвотна. Ён марыць пра сям'ю і дзяцей. А яшчэ збіраецца паспрабаваць сябе ў прамысловым альпінізме, лічыць гэтую галіну перспектыўнай.

* * *

34-гадовы **Яўген Русак** асуджаны на 11 гадоў:

— Па частцы распаўсюджвання я сваю віну не прызнаў. Ужываў — так, але не больш.

Жэня ў мінулым прафесійны спартсмен. Хлопец гуляў за Нацыянальную зборную па валейболе:

— Траўмаваў сур'ёзна спіну. Нейкі час сядзеў на таблетках, працягваў трэніравацца. Боль не сціхаў. Я выдатна разумеў, што мая кар'ера падыходзіць да завяршэння. Пачаў шукаць суцяшэння ў наркотыках. Думаў вырашыць адну праблему, а ў выніку іх стала яшчэ больш.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Мінск — Івацэвіцкі раён — Мінск.

ЛЯЖЫЦЬ? ХАЙ ЛЯЖЫЦЬ

...Як вядома, колькі людзей, столькі і меркаванняў. Я, напрыклад, лічу, што ў кожнага з нас павінны быць пэўныя мэты. Гэта — па-першае, а па-другое — жаданне іх здзяйсняць. Калі такога ў чалавека няма, то няма, відаць, і сэнсу ў ягоным жыцці.

Мне, напрыклад, з ранняга дзяцінства хацелася мець вышэйшую адукацыю. Атрымаць яе пры маіх сямейных абставінах было неймаверна цяжка! Можна было адступіць, здрадзіць сваёй мары, аднак гэта — не ў маім характары: я скончыла не адну, а нават дзве ВНУ, хоць пазней (аб гэтым таксама варта сказаць) і зразумела, што галоўным доказам найлепшых чалавечых якасцяў ды арганізатарскіх здольнасцяў з'яўляюцца зусім не дыпломы...

Але ж вось яны з'явіліся, а пасля гэтага — і новыя мэты-жаданні. Я навучылася вадзіць машыну, іграць на гармоніку і нават — каб паспытаць свайго сапраўднага мёду — занялася пчалярствам.

Трэба сказаць, што з ім, як і з многім іншым: мала было захацець, трэба шмат чаго ведаць і шмат што ўмець. Добра, што побач былі вопытныя пчаляры-аднавяскоўцы. Пад іх «чулым кіраўніцтвам» і з цягам часу я займела пчальнік, у якім было ўжо 12 вулляў, што ў маім, на жаль, не юным узросце нават і мнагавата, бо цяжка...

Як на тое ліха, гэтыя скаргі быццам нехта пачуў: леташняй восенню на маіх пчол напалі чужыя і, на вялікі жаль, перамаглі. Вуллі засталіся пустыя, і глядзець на іх стала вельмі балюча. А таму я зноў узялася дзейнічаць. За 30 кіламетраў ад уласнай вёскі знайшла гаспадара, які прадаваў сем'і пчол, і з «групай таварышаў» паехала купляць.

Што ўразіла, прадаўцом аказаўся інвалід-калясачнік з пчальніком у паўсотні вулляў!

Мы ў яго забіралі чатыры.

Для транспарціроўкі мой прыяцель-кансультант прадугледзеў, здаецца, усё: закрыў латкі, зверху шчыльна залажыў іх дошчачкамі і прыкрыў коўдрамі. Цяжкаватыя накрыўкі мы пакідалі гаспадару, бо сем'і я планавала пасяліць у сваіх пустуючых «хатках».

Далей заставалася ці не самае простае: вуллі з пчолкамі саставіць у кузаў грузавой машыны, туды ж пасесці маім памочнікам-мужчынам і дабрацца дамоў...

Выязджалі мы, праўда, цямком, але ж, далібог, даехалі б без прыгод, калі б у адным месцы шлях нашай машыне не перакрыў так званы ляжачы паліцэйскі. Яго, не эканомячы будматэрыялы, укладлі якраз насупраць школы і задралі так...

Карацей, кузаў грузавіка падкінула, прычым падкінула так, што ў вуллях расхінуліся дошчачкі і пчолкі, адпаведна, выпаўзлі ў кузаў...

Крыку, шуму, а заадно і мацюкоў там узнікла столькі!..

Шафёру прыйшлося рэзка спыніць машыну, а нам — пры скупым святле ліхтара — запаліць дымар ды з яго дапамогай папраўляць непаладкі.

Зрабілі, як быццам, усё, даехалі, і тым не менш навасельцаў у двор мужчыны ўносілі з вялікай асцярогай і толькі назаўтра пасялялі ў свае дамкі...

Цяпер яны там жывуць і шчыруюць — радуюць сэрца ды час ад часу нагадваюць пра таго ляжачага паліцэйскага. «Дзякуючы» яму адзін з нашых мужчын досыць доўга насіў на твары адметную пухліну.

Ніна Бурко,
в. Капланцы, Бярэзінскі раён.

КУПІНА З СЮРПРЫЗАМ

Час майго дзяцінства — ужо далёкія шасцідзясятыя мінулага стагоддзя — вясёлая, бестурботная пара! Хаця...

На летніх канікулах я, вядома ж, хадзіла з сябрамі на рэчку, але пры гэтым дапамагала бацькам па гаспадарцы, а яшчэ — зарабляла грошы. Як зараз помню — за кілаграм чарніц плацілі сорак капеек. Для нас, дзяцей, — вялікія грошы! І такой бяды, што праца — таксама не з лёгкіх.

Напрыклад, за раку, у Лаздунскі лес, яшчэ трэба было дайсці, у ім — не заблудзіцца. Мой тата, як правіла, быў правадніком, а мы, вяскоўцы з яго «каманды», стараліся не адстаць. Яшчэ і таму, што разам, у кампаніі, і смялей было, і весялей.

...Дык вось, той раз гадзін у сем раніцы мы ўжо рушылі ў дарогу. Ішлі цугам адно за адным, па роснай траве, з плоскімі кошыкамі за плячыма (у такіх зручней потым несці ягады, бо шлях не блізкі — кіламетраў шэсць)...

Колькі мы там прайшлі ды спыніліся, бо натрапілі на добрыя лапіны чарніц. Збіраць іх — асабліва дзе шмат і буйныя — адно задавальненне! Таму кожны спяшаўся — стараўся набраць паболей.

Адзінае — дзень нам выпаў вельмі спякотны: бліжэй да абеду запякло ўжо так, што не было чым дыхаць. А мне да ўсяго — разбалелася галава. Таму, кінуўшы на зямлю нейкую апранаху, я прысела ў цяньку. Іншыя таксама сталі «прызямляцца» побач. Тата даў мне лусту хлеба са скваркай ды агурком... Я з'ела і неўзабаве заснула...

Падхапілася ад піску, енку, рогату і нічога не магла зразумець. Адна з жанчын, цётка Тамашыха, як падсмаленая з крыкам насілася паміж дрэў, прычым — зрываючы, скідаючы з сябе спадніцу, хустку, блузку... Хутка засталася ў адным споднім...

Дзеці, гледзячы на гэта, аж заходзіліся ад рогату, дарослыя — на ўсе вочы глядзелі, але сцяміць нічога не маглі.

...Потым стала вядома, што цётка, прысеўшы пад сасной і добра задрамаўшы, выбрала для гэтага не найлепшае месца: сваім шыракаватым азадкам яна «ўтаптала» ў зямлю малапрыкметную купіну, у якой быў велікаваты... мурашнік.

Яго насельнікі, ну вядома ж, не пацярпелі такога нахабства і вырашылі адпомсціць...

Мяркуючы па рэакцыі цёткі, расплата была не жартоўнай! Можна сказаць, на вачах цела жанчыны стала пакрывацца чырвонымі плямамі-пухірамі, твар палаў ад болю і сораму, бо гэта ж цяпер жанчыны (ды і мужчыны...) амаль голымі выступаюць са сцэны, а тады — бронь божа!

...З той пары шмат часу прайшло — змяніліся норавы. А вось памяць — яна засталася. І будзіць яна тугу па малой радзіме, і кліча вярнуцца ў дарагі для сэрца куток.

Галіна Нічыпаровіч,
в. Магільна, Уздзенскі раён.

НА НІЖНЯЙ ЖЭРДАЧЦЫ СЯДЗЕЛІ...

Жонку сабе Мацвей прывёз з войска, здалёку, ажно з Урала, але ж нешта з ёю не ўжыўся. У хуткім часе (дочкі-блізняты ў школу толькі збіраліся) кінуў ён сям'ю ды паехаў некуды ў Казахстан. Кіра, яго жонка, ціхая, працавітая жанчына, засталася ў вёсцы, сама гадавала дачок, сама потым даглядала свякруху. Прапаноўвалі ёй аддаць цяжкахворую ў дом састарэлых — нявестка адмовілася. Была з ёй да апошняга, па-людску пахавала. А сын — ён нават адвітацца тады не прыехаў.

Жанчыне, вядома ж, цяжка ў жыцці прыйшлося, бо да ўсяго яна трымала немалую гаспадарку, працавала ў саўгасе. Не сказаць, каб з некім блізка сябравала, але ж і ворагаў таксама ніколі не мела: хата яе была неяк з краю, як бы адсунутая ад вуліцы... А збоку пры ёй хлеў ды гарод, а далей — хмызняк, альшэўнік.

...У той дзень жанчына выпусціла на падворак курэй, выгнала на пашу карову, прапаліла ў печы ды неўзабаве пайшла ў суседнюю вёску, каб купіць сабе цукру.

І туды, у краму за пяць кіламетраў, і назад яна ішла хутка. Да таго ж рукі ёй адрывалі пакупкі. Так што Кіра добра-такі стамілася і дома, адразу ж, хацела адпачыць. Толькі прылягла, як чуе — стук у вакно:

— Жывая ты там ці не? — пыталася суседка. — Ідзі ў двор... Нешта з тваімі курамі зрабілася.

Кіра тут жа выскачыла з хаты і... спынілася: усё яе птаства ляжала на зямлі, і толькі асобныя з курэй яшчэ крыху варушылі дзе лапамі, дзе крыламі...

— Гэта, вядома ж, не так сабе, — абуралася ўголас суседка, — гэта ж ім нейкай атруты падсыпалі. А яны (колькі ж там мазгоў у курыцы?) яе і хапянулі... Таму ты, бабачка, пер'е, можа, і скарыстай, калі трэба, а вось мяса — не, ні ў якім разе! Выкідвай і не шкадуй!

Што заставалася Кіры: толькі заплакаць ды моўчкі ўзяцца за працу. Абскубла сваіх сакатух, не чапаючы крылы (бо там пер'е дробнае) ды і занесла за хлеў, выкінула ў сліўняк — заўтра меркавала закапаць, бо сёння на гэта сілы ўжо не было. Жанчыну да ўсяго душыла крыўда. «Хто ж гэта і за што патруціў маіх курэй? — думала яна. — Каго і чым я магла ўгнявіць?»...

Доўга не магла заснуць, а раніцай, як заўжды, падхапілася даіць карову, па звычцы зазірнула ў курятнік. І там на ніжняй жэрдачцы сядзелі яе певень і ўсе пяць курачак. Праўда, выглядалі яны так, што Кіра аж зайшлася ад рогату...

На «гук» — да таго ж такі нечаканы — тут жа прыбегла суседка. Яна і «раскрыла карты»:

— Гэта ж учора Ігнат (таксама сусед, толькі з іншага боку), мусіць, гарэлку гнаў, брагу разліў, пераносячы, а куры яе і паклявалі — многа ім трэба?

Карацей, праз гадзіну-другую вёску абляцела навіна пра Кірыных «п'яных» курэй. На іх жа, амаль дагала «раздзетых», людзі прыходзілі паглядзець і пасмяяцца: калі няма з чаго, дык яно і сапраўды — можна і з курэй.

Уладзімір Пугач,
в. Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Разбітае сэрца

Пра мясцовыя легенды, якія могуць аказацца чыстай праўдай

На шыкоўных гарадскіх клумбах, якія высаджваюць і даглядаюць спецыялісты камунальных службаў, ды на дачных кветніках, дзе гаспадыні спаборнічаюць у селекцыі нябачаных відаў і сартоў, гэтыя сціплыя кветкі не ўбачыш. Нават на вясковых агародчыках яны ўжо амаль звяліся — і там іх выцеснілі больш буйныя і яркія півоні і касачы. А тут раптам нечакана ў самым цэнтры сталіцы, у адным з цяністых старых двароў, разбітае сэрца закрасавала, падстаўляючы сонцу кожную сваю руковую з белым «завушнічку». І так гэта было неспадзявана і кранальна, бы сустрэў даўняга, калісьці вельмі добра знаёмага, а цяпер амаль забытага чалавека, і разам з ім вярнуліся і шчыльна ахінулі вобразы, гукі, пахі з далёкага-блізкага мінулага.

У нашай мясцовасці гэтыя кветкі звалі на польскі манер — гронца сэрца. Гадоў з трыццаць назад іх вялізныя кусты красаваліся ці не на кожнай вясковай клумбе, і майскімі душнаватамі вечарамі іх травяніста-мядовы пах перамагаў усе водары позняй вясны і лунаў над вуліцай. Здавалася, яго нават можна памацаць рукамі. На апошні званок і на першыя выпускныя экзамены ўсе школьнікі неслі гронца сэрца ў букетах. Яго «завушнічкі» трымцелі ў такт хадзе, і здавалася, што на зялёныя галінкі паселі дзівосныя пчолы з руковымі крылцамі, якія вось-вось узнімуцца ў неба чароўным роем... Пры тым, што гэтыя кветкі былі паўсюль, іх гаспадыні вельмі беражліва. Крый божа было, полюнуў клумбу, вырваць хоць каліва ад куста гронца сэрца. На зіму яго стараліся прыкрыць апалым лісцем, каб не вымерзла. Дзяліліся гэтымі кветкамі, асабліва з людзьмі прыезджымі, таксама неахвотна...

У такога трапяткога стаўлення была свая прычына. Лічылася, што нашы мясцовыя кветкі адмысловыя, і такіх больш няма нідзе. Старыя бабулі нават гісторыю пра гэта расказвалі, пераконваючы, што іхнія бабулі яе непасрэднымі сведкамі былі... Напрыклад, мая бабка Амелія, якая нарадзілася ў самым пачатку мінулага стагоддзя, распавядала, што бабуля яе бацькі служыла тады пакаёўкай у тым самым маёнтку, дзе ўсё і пачалося...

У маёнтку жыла прыгожая паненка, да якой сваталіся шляхціцы з усяго навакольля. Але бацька яе быў багаты і вельмі наравісты, таму адмаўляў кавалерам, заўсёды знаходзячы важкую прычыну. З цягам часу сваты едзіць перасталі, а паненка самотна сядзела ў багатым белым палацы, ужо ні на што не спадзеючыся. Але тут з губернскага Мінска прыехаў да суседа сваяк. Быў ён малады, прыгожы, заможны, а яшчэ і мастак. Стары ўпарты пан замовіў яму партрэт сваёй ненагляднай дачкі. Мастак стаў часта бываць у іхнім доме, нават заставацца з паненкай сам-насам падчас работы над партрэтам. А дзяўчыне, якая сядзела ледзь не пад замком, абдзеленая мужчынскай увагай, шмат не трэба было, каб закахацца. І малады чалавек адказваў ёй узаемнасцю, але разумеў, што шанцаў у яго нуль, бо бацька паненкі вельмі не ўхваляў яго занятак, які лічыў зусім не высакародным.

Усё скончылася без гучных сцэн і трагедый. Пазаляцаўшыся лета, напісаўшы той партрэт і пераканаўшыся, што дзяўчыну за яго не выдадуць, мастак з'ехаў і больш ніколі да сваяка ў нашы мясціны не прыязджаў. Увесну толькі прыслаў паненцы скрыначку, у якой быў корчык невядомай да гэтага кветкі. «Ты разбіла маё гарачае сэрца» — было напісана ў прыкладзенай запісцы. Корчык пасадзілі каля палаца, паненка сама песціла яго і даглядала, зімой накрыла лісцем, каб не змерз. А праз год у маі кусцік выпусціў тонкія доўгія стрэлкі, і на кожным трымцелі руковыя кветкі, сапраўды вельмі падобныя на расколатыя сэрцайкі.

Паненка тая так і не выйшла замуж, нават калі праз некалькі гадоў памёр яе бацька-дэспат. Яна сама гаспадарыла ў маёнтку, і ўсе кветнікі каля яе палаца былі засаджаныя аднымі кветкамі, якія яна па-польску звала «гарачае сэрца», а мясцовая гаворка зрабіла з іх «гронца сэрца». Яна сама даглядала іх і вельмі пільна сачыла, каб ні адзін флянец, ні адна галінка з яе падворка не прапала. Бо верыла, што так зможа прыцягнуць у свой панылы дом няспраўджанае каханне і аднойчы ён, яе герой, абавязкова вернецца. А калі, так і не дачакаўшыся і не пакінуўшы пасля сябе спадчыннікаў, яна ў сорак два гады ціха сканала ад сухотаў, усе мясцовыя жанчыны кінуліся да клумбаў, якія засталіся без гаспадыні, каб адкапаць сабе кавалачак дзівоснай кветкі — сімвала надзеі і вернасці...

СТРАЛЕЦ. Будзьце гатовыя да барацьбы, ад вызначанага не варта адступаць пры першай жа сустрэчы з перашкодамі. На гэтым тыдні такіх будзе нямала. У выпадку неабходнасці лепш звярнуцца не да дапамогі сяброў, а да парад кампетэнтных спецыялістаў. У чацвер пастарайцеся знізіць нагрузкі, бо ў гэты дзень вам будзе ўласцівая павышаная стамляльнасць. Пазбягайце сварак у сям'і, хоць і будзеце больш звычайнага схільныя да раздражняльнасці.

КАЗЯРОГ. Неабходна сканцэнтраваць свае намаганні на дасягненні пастаўленых мэт. Не бойцеся крытыкі, калі яна будзе канструктыўнай. У панядзелак рэалізацыю планаў мае сэнс пачаць ужо ў першай палове дня — не марнуйце час дарма. На аўторак, наадварот, пажадана не прызначаць важных мерапрыемстваў і сустрэч. У выхадныя трэба адпачыць і аднавіць затрачаныя сілы. Паспрабуйце быць больш памяркоўнымі ў адносінах да блізкіх людзей, стрымлівайце свае бурныя эмоцыі.

ВАДАЛІЎ. Тыдзень будзе вельмі ўдалы, нягледзячы на некаторую аднастайнасць і руцінную працу. Калі вы ў сваіх планах улічыце інтарэсы калег і дзелавых партнёраў, то ад гэтага толькі выйграеце. Гэта будзе спрыяць умацаванню вашага аўтарытэту. Паспрабуйце не звязваць сябе ніякімі абяцаннямі ў асабістай сферы. Калі збіраецеся ў адпачынак, то яго добра было б правесці на беразе ракі, возера, мора ці хоць бы ручая.

РЫБЫ. Наспеў час рашучых дзеянняў, а вы ўсё ніяк не можаце разабрацца ў сабе. Паспрабуйце ўзяць сябе ў рукі і вызначыць генеральную лінію развіцця кар'еры і асабістага жыцця. На гэтым тыдні вас можа чакаць вялікая колькасць сустрэч і перагавораў. Менш займайцеся руціннай працай і больш увагі надавайце творчасці, бо імправізацыі могуць аказацца значна больш карыснымі, чым дакладны разлік. У суботу будзьце асцярожныя: вас могуць падпільнаваць спакушэнне і падман.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.54	21.20	16.26
Віцебск —	4.37	21.16	16.39
Магілёў —	4.44	21.10	16.26
Гомель —	4.49	20.58	16.09
Гродна —	5.11	21.34	16.23
Брэст —	5.19	21.26	16.07

Месяц

Поўня 19 мая.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Іосіфа, Кірылы, Мяфодзія, Макея, Нікадзіма, Расціслава, Сафрона.*
К. *Жанны, Зузаны, Магдалены, Марыі, Вінцэнта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

24 МАЯ

У краіне

Дзень славянскага пісьменства і культуры. Адзначаецца ў гонар славянскіх асветнікаў і прапаведнікаў хрысціянства Кірылы і Мяфодзія, якія далі славянскаму свету кірыліцу (863) і заклалі падмурак славянскіх літаратур.

1512 год — нарадзіўся Мікалай Радзівіл (мянушка Руды), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, сын гетмана Ю. Радзівіла. Асаблівы рост уплыву Радзівіла на дзяржаўныя справы звязаны з заключэннем шлюбу яго сястры Барбары з вялікім князем ВКЛ Жыгімонтам Аўгустам у 1547 годзе. Мікалай Радзівіл у 1549 годзе атрымаў у яго правы княжацкага намесніка з рэзідэнцыяй у Вільні. Быў ваяводам троцкім і віленскім, вялікім гетманам ВКЛ, канцлерам ВКЛ. Камандаваў войскам ВКЛ у пераможнай Ульскай бітве (1564). Рашуча выступаў супраць заключэння уніі з Польшчай. У 1579 годзе ўдзельнічаў ва ўзяцці Полацка і ў паходзе на Пскоў. Памёр у 1584 годзе.

1904 год — нарадзіўся Адам Герасімавіч Русак, паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1930 годзе скончыў Беларускі музычны тэхнікум, у 1934-м — Ленінградскую кансерваторыю. Працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога опернага тэатра, Белдзяржфілармоніі. Аўтар кніг паэзіі «Песні і вершы», «На родных нівах», кніг вершаў для дзяцей «У Буслацы», «Добра ведаю ўрок». Шырока вядомыя песні на вершы Русака «Бывайце здаровы», «Лясная песня», «Толькі з табою» і інш. Памёр у 1987 годзе.

У свеце

1844 год — амерыканскі вынаходнік Самуэль Морзэ з дапамогай тэлеграфнага апарата ўласнай канструкцыі ўпершыню адправіў тэлеграму спецыяльным кодам (азбукай Морзэ). Самуэль Морзэ, які некалькі гадоў працаваў над стварэннем тэлеграфа, патрацію на свае вопыты апошнія грошы. Вынаходнік зразумеў, што разбурацца яго мара. Тады ён апусціўся на калені і сказаў шэптам: «О, Госпадзі! Я не ведаю, што прынясе мне заўтрашні дзень, але я веру, што Ты дапаможаш мне!». На наступную раніцу паштальён прынёс яму паведамленне: «Ваша прашэнне зацікавіла Кангрэс. Для паспяховага завяршэння Вашай працы вырашана асігнаваць з дзяржаўных сродкаў 30 тысяч долараў». І вось надышло 24 мая 1844 года, калі ўсе работы былі завершаны і ўсё было гатова для адпраўкі па электрычных дратах самай першай тэлеграмы. Яе тэкст Самуэль Морзэ склаў разам з Ганнай Элзворт, дачкой уладальніка патэнтнага бюро. Тэкст утрымліваў усяго чатыры словы:

«Дзіўныя справы Твае, Госпадзі».

Такой была самая першая ў свеце тэлеграма.

1905 год — нарадзіўся Міхаіл Аляксандравіч Шолахаў, савецкі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Акадэмік АН СССР. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар раманаў «Паднятая цаліна», «Ціхі Дон», «Яны змагаліся за Радзіму» ды інш. Многія творы пісьменніка экранізаваны. Лаўрэат Дзяржаўнай і Ленінскай прэмій СССР. Памёр у 1984 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Сум сучаснай моладзі.

— Мне 27 гадоў, а мама да гэтага часу спрабуе лезці ў маё асабістае жыццё! Ну вось чаму нельга моўчкі даваць кішэнныя грошы?

Газеты заваленыя аб'явамі кшталту «вярну мужа». А аб'яў «вярну жонку» няма. Цікава, чаму?

— Мама, глядзі — голуб! Дай хлеба!

— Еш без хлеба.

— Мама, мамачка, дай мне грошай, я аддам іх беднай жанчыне!

— Якая ты ў мяне добрая, дачушка! Бедная бабулька, яна не можа працаваць!

— Чаму не можа? Яна прадае ледзяшы.

Калі б яны не хацелі, каб я страсаў попел на падлогу, яны б паставілі хоць бы пару попельніц у гэтай трэнажорнай зале.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1606.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 мая 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

24 мая 2019 г. № 21 (506)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІЁНЫ: ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

У ЦЭНТРЫ КРАІНЫ, ЖЫЦЦЯ І ПАДЗЕЙ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і Андрэя САЗОНАВА.

Мінская вобласць — адна з найбольш эканамічна развітых сярод шасці абласцей Беларусі. Уклад цэнтральнага рэгіёна ў эканоміку краіны складае каля 20 %, інакш кажучы, пятую частку ўсяго валавога ўнутранага прадукту. Выгаднае геаграфічнае становішча, шырокая сетка аўтамабільных і чыгуначных дарог спрыяюць развіццю прамысловасці, сельскай гаспадаркі, турызму, культуры, інвестыцыйнаму клімату. На Міншчыне знаходзяцца такія флагманы машынабудавання, як Беларускі аўтамабільны завод па выпуску магутных кар'ерных самазвалаў, прадпрыемства «Беларуськалій» па здабычы калійнай солі. У вобласці рэалізуецца шмат інвестыцыйных праектаў, у прыватнасці будаўніцтва Нежынскага горна-абагачальнага камбіната, Кітайска-беларускага парку «Вялікі камень» і іншыя. Міншчына перш за ўсё моцная рэгіёнамі, людзьмі, якія ўносяць значны ўклад у яе развіццё разам з мясцовымі ўладамі, Саветамі дэпутатаў.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 3—14

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

САБРАЦЬ, АДСАРТАВАЦЬ, ПЕРАПРАЦАВАЦЬ

Якім чынам смецце ператварыць у здабытак?

Гэтым пытаннем задаюцца сёння ўсе цывілізаваныя краіны. Беларусь не выключэнне. Дарэчы, у Гомелі ёсць станоўчы вопыт. Менавіта яго вывучалі ўдзельнікі рэспубліканскага семінара, які арганізавала Міністэрства ЖКГ на прыкладзе аб'ектаў абласнога цэнтра. Тут, між іншым, быў пабудаваны першы ў краіне біямеханічны завод, дзе адходы сартуюць і аддзяляюць прыдатныя да далейшага выкарыстання другасныя рэсурсы. Тут пачалі будаваць закрытыя кантэйнерныя пляцоўкі для паасобнага збору адходаў жыхарамі. Цяпер і прыватны сектар ахоплены такой практыкай.

Персанальныя каляровыя кантэйнеры

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КУХАРАЎ адзначае, што Гомель цікавы многімі эксперыментамі ў сферы ЖКГ. Што датычыцца адпрацоўкі механізму абыходжання з адходамі, тут вельмі вялікі сектар індывідуальнай забудовы: 28 тысяч дамоў, у якіх жывуць 62 тысячы чалавек. Значыць, і смецця дастаткова. Цяпер эксперыментам ахоплены жыхары некалькіх вуліц у Савецкім раёне — усяго 700 дамоў.

стар. 15

Фота Ірыны САВОЧНАЙ.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Мільярд долараў

узаемнага гандлю плануюць дасягнуць Беларусь і Індыя да 2020 года.

стар. 2

Як справы ў спадарожніка

Што ўжо зроблена і чаго не хапае ў Заслаўі?

стар. 13

У лесе ці ў полі?

Чаму жыхары Бараўлян не знаходзяць паразумення наконт месца пабудовы сацыяльнага аб'екта.

стар. 13

Нарач вабіць турыстаў

Экспарт паслуг Мядзельшчыны расце, але больш зарабіць можна не толькі за кошт курорта.

стар. 14

Грант у 10 тысяч еўра

атрымала Магілёўская асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў.

стар. 16

ВАРТА ПРАЯЎЛЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ І ВЫКАЗВАЦЬ ПРАПАНОВЫ

Пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі пад кіраўніцтвам Міхаіла Мясніковіча прайшло на пачатку тыдня. У цэнтры ўвагі была арганізацыя працы памочнікаў членаў Савета Рэспублікі і агучаны яго вынікі на пасяджэнні Прэзідыума. Для павышэння эфектыўнасці працы памочнікаў членаў Савета Рэспублікі падрыхтаваны практычныя рэкамендацыі, якія былі падтрыманы Прэзідыумам.

www.sovrep.gov.by

Як паведамляе сайт верхняй палаты парламента, напярэдадні быў праведзены маніторынг работы памочнікаў членаў Савета Рэспублікі і агучаны яго вынікі на пасяджэнні Прэзідыума. Для павышэння эфектыўнасці працы памочнікаў членаў Савета Рэспублікі падрыхтаваны практычныя рэкамендацыі, якія былі падтрыманы Прэзідыумам.

У цэлым адзначана, што з моманту правядзення папярэдняга маніторынгу дзейнасці памочнікаў членаў Савета Рэспублікі адбыліся пазітыўныя змены: ліквідаваны асобныя недахопы ў арганізацыі работы памочнікаў, на ўсіх сайтах выканкамаў размешчана неабходная інфармацыя пра іх, больш сістэмнай стала праца са зваротамі грамадзян.

Падводзячы вынікі разгляду пытання, Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтаваў увагу на тым, што ўважлівае стаўленне да людзей павінна быць прыярытэтам для членаў Савета Рэспублікі і іх памочнікаў. «Работа са зваротамі грамадзян не павінна быць фармальнай, не павінна быць адпісак. Кожнаму, хто звярнуўся, трэба дапамагчы. Гэта задача, якую ставіць перад намі кіраўнік дзяржавы», — сказаў ён.

Патэнцыял памочнікаў павінен быць максімальна задзейнічаны для своечасовага вывучэння грамадскай думкі, маніторынгу сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і аператыўнага вырашэння актуальных пытанняў на месцах, дадаў старшыня Савета Рэспублікі. Пры прызначэнні памочнікаў не павінна быць ніякага «кумаўства», падкрэсліў ён.

Што датычыцца маніторынгу дзейнасці памочнікаў членаў Савета Рэспублікі, то яго будуць праводзіць рэгулярна. Гэта шмат у чым дапаможа палепшыць іх працу, адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, акрамя работы над памылкамі, неабходна таксама паказваць канкрэтныя станоўчыя прыклады працы памочнікаў іх калегам. Гэта добрая школа, магчымасць падзяліцца вопытам. Акрамя таго, памочнікам варта часцей праяўляць ініцыятыву, выказваць свае прапановы, у тым ліку па ўдасканаленні заканадаўства.

Падчас пасяджэння Прэзідыума таксама было ўзнята пытанне аб ключавых сумесных праектах Беларусі з Казахстанам дзеля далейшага разгляду на падкамісіі па развіцці супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Сената Парламента Рэспублікі Казахстан.

Як гаспадар не любіць праводзіць вольны час на прысядзібным участку? Высаджваць кветкі, дэкаратыўныя кусты, даглядаць іх — гэтыя клопаты прыносяць задавальненне, зарад станоўчых эмоцый.
З іншага боку, гэта — найлепшы адпачынак. Сапраўды, прыемна, калі на падворку, каля дома шмат зеляніны, утульнасць, чысціня. Дбайныя людзі робяць Мінскую вобласць больш прыгожай, непаўторнай, камфортнай для пражывання. Плённа папрацавалі жыхары цэнтральнага рэгіёна разам з дэпутатамі, мясцовымі саветамі падчас месячніка навядзення парадку на зямлі.

— Ці не так, Наталля Віктараўна?

— Разам з дэпутацкім корпусам 28-га склікання ў цэнтр сваёй работы мы ставім добраўпарадкаванне і навядзенне парадку на зямлі. Гэтага патрабуюць даручэнні кіраўніка дзяржавы, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, старшыні Мінаблвыканкама. Канешне, мы і самі добра разумеем, што для нас гэтыя пытанні з'яўляюцца прыярытэтнымі.

У красавіку на Міншчыне прайшоў месячнік па навядзенні парадку на зямлі. Можна сказаць, што ні адзін населены пункт не застаўся без нашай увагі. Работу мы пабудавалі такім чынам, каб у ёй былі задзейнічаны дэпутаты сумесна з нашымі грамадзянамі. Бо, як вядома, паважаныя выбаршчыкі — першыя нашы памочнікі. Для нас было вельмі важна прыцягнуць іх да навядзення парадку. І яны адгукнуліся на заклік. Не памылюся, калі скажу, што ўсе гаспадары неабыякавыя да прыгажосці, кожнаму з іх прыемна, калі на тэрыторыі яго домаўладання ўсё добра. Мы прасілі жыхароў цэнтральнага рэгіёна перш за ўсё звярнуць увагу на стан агароджаў, платоў вакол сваіх дамоў. Многія пачулі нас, выйшлі, паправілі іх. Тыя, што на балансе сельсаветаў, мы зноў жа ўладкоўвалі, фарбавалі, выраўноўвалі сумесна з насельніцтвам.

У полі нашага зроку і парадак на грамадзянскіх могілках. Гэты кірунак працы, лічу, вельмі важны для ўсіх нас, гэта даніна памяці нашым блізкім, родным, сваякам. Гэта месцы, да якіх ніхто не можа застацца абыякавым. Добраўпарадкоўваць могілкі дапамагалі старасты вёсак — вялікі ім дзякуй. Грамадзян, якія прыходзілі прыбіраць пахаванні сваіх блізкіх, мы прасілі навесці парадак на перыметры, за тэрыторыяй могілак. І людзі пачулі нашу просьбу і пасадзейнічалі. Вялікую ўвагу аддаём мы стану помнікаў, брацкіх магіл, мемарыялаў, воінскіх пахаванняў. Тыя трагічныя падзеі мы не маем права забываць: неабходна помніць і ўшаноўваць памяць людзей, якія аддалі жыццё за нашу будучыню, і захаваць гэтую памяць для нашчадкаў.

ПЛАНАЎ — НА МІЛЬЯРД!

Беларусь і Індыя маюць намер істотна нарасціць тавараабарот за кошт пашырэння сфер супрацоўніцтва і стварэння сумесных вытворчасцяў.
Да 2020 года краіны плануюць наблізіцца да аб'ёму ўзаемнага гандлю ў 1 мільярд долараў. Гэта падштурхоўвае бакі да больш актыўнага пошуку новых форм узаемадзеяння. У прыярытэце — умацаванне інвестыцыйнага супрацоўніцтва і пашырэнне вытворчай кааперацыі. Пра тое, якія кірункі партнёрства цікавыя індыйскаму бізнесу і што можа станоўча паўплываць на развіццё двухбаковых сувязяў, БелТА расказаў ганаровы консул Беларусі ў Мумбаі Лаліт Чакхані.

www.chokhanipharma.com

— Спадар Чакані, у вас багаты вопыт прасоўвання інтарэсаў індыйскага бізнесу ў краінах СНД. Ці ёсць перавагі працы ў Беларусі?

— Самае галоўнае — гэта давер. Да Беларусі ён ёсць. Індыйскі бізнес добра разумее: калі канкрэтныя дамоўленасці з беларускім бокам дасягнуты, яны будуць рэалізаваныя. Другое — гэта бяспека. Ва ўмовах узмацнення глабальнай напружанасці Беларусь стала яшчэ больш прывабнай краінай, бо тут бяспечна. І для бізнесу, і для чалавека. Я прыязджаю сюды часта і магу гуляць па вуліцах да глыбокай ночы. У іншых еўрапейскіх гарадах гэта наўрад ці магчыма.

Трэцяе — гэта чысціня і парадак, якія тут заўсёды. Яны прыцягваюць турыстаў, і добразычлівасць беларусаў спрыяе гэтаму. Не менш важна тое, што ў беларусаў ёсць жаданне нешта рабіць для паляпшэння сваёй краіны. Усё гэта — несумненўныя перавагі.

У Беларусі ўжо выконваюцца праекты з удзелам індыйскіх кампаній. Добры прыклад — фармацэўтыка. У Індыі багаты вопыт, тэхналогіі, магчымасці камерцыялізацыі фармпрадукцыі. У беларускага боку — добра падрыхтаваныя кадры, веды, сучасныя вытворчасці. Разам мы можам дамагчыся поспехаў. Я ў гэта шчыра веру.

Зусім нядаўна на сустрэчы са старшынёй Савета Рэспублікі, упаўнаважаным па супрацоўніцтве з Індыяй Міхаілам Мясніковічам, мы абмяркоўвалі, як надаць дынаміку беларуска-індыйскім адносінам. Галоўнае, што ёсць узаемная зацікаўленасць. За гэтым цягнуцца новыя сумесныя праекты. На сустрэчы абмяркоўваўся адзін з іх — па стварэнні ў Мінску сумесна з найбуйнейшай індыйскай кампаніяй Cipla Limited навукова-тэхналагічнага цэнтра па вырабе лекавых прэпаратаў на базе прадпрыемства «Акадэмфарм» НАН Беларусі. У яго ўжо інвеставаны мільён долараў.

Летам чакаецца візіт у Мінск дэлегацыі кампаніі Cipla на чале са старшынёй праўлення доктарам Юсуфам Хамідам. Дарэчы, да Беларусі ў яго асабліваe стаўленне, бо яго маці адсюль родам. Гэта шмат у чым вызначыла яго выбар краіны ў якасці пляцоўкі для фармвытворчасцяў. Гаворка ідзе пра лекі для лячэння ВІЧ-інфекцыі, гепатыту В і гепатыту С, хваробы Альцгеймера, артэрыяльнай лёгачнай гіпертэнзіі. З выхадам прэпаратаў на рынак кошт асобных з іх для беларускіх спажыўцоў паменшыцца ў 10 разоў. Паводле нашых ацэнак, гэтыя лекі будуць запатрабаваныя не толькі на ўнутраным рынку, але і ў краінах СНД.

У будучыні ў кампаніі ёсць планы арганізаваць на базе гэтага цэнтра выпуск дарагіх лекавых прэпаратаў для лячэння рэдкіх захворванняў.

— Для гэтага патрэбныя сапраўды высокія тэхналогіі і адпаведныя веды...

— Cipla пераканалася ў высокай кампетэнцыі беларускіх вучоных. Яны здольныя паспяхова асвоіць тэхналогіі, якія кампанія можа даць. У Мінску таксама плануецца адкрыць цэнтр падрыхтоўкі кадраў для трэціх краін, у тым ліку Манголіі, Таджыкістана. Зараз на гэтыя паслугі вялікі попыт.

Гэты праект — добры прыклад, але могуць быць і іншыя. Новыя магчымасці супрацоўніцтва будуць абмеркаваны падчас візіту ў Мінск ганаровых консулаў у Непале, Шры-Ланцы, Бангладэш, Калькуце і Мумбаі, які запланаваны на 4—8 жніўня бягучага года. Мэта гэтага візіту — умацаваць двухбаковыя адносіны, абмеркаваць магчымасці ліквідацыі тых бар'ераў, якія абцяжарваюць работу бізнесу.

— Якія яшчэ напрамкі вы разглядаеце ў якасці прыярытэтных для партнёрства?

— Іх некалькі. Плануем супрацоўнічаць з аршанскімі вытворцамі ільновалакна. Індыйскія інвестары высока ацанілі якасць беларускага лёну. Адна з кампаній ужо падпісала пагадненне аб экспарце гэтай прадукцыі ў Індыю. Прапрацоўваецца магчымасць арганізацыі ў Оршы вытворчасці па вырабе адзення з беларускага лёну па італьянскіх лекалах для наступнай пастаўкі ў трэція краіны.

Яшчэ адзін напрамак — кіно-індустрыя. Тут вельмі вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва. Ужо летам на базе «Беларусьфільма» пачнуцца здымкі першага індыйскага фільма. Упэўнены, праект завершыцца паспяхова і стане прыкладам для развіцця партнёрства ў гэтай галіне.

Акрамя таго, у наступным годзе мы маем намер арганізаваць у Беларусі індыйскі фестываль, на які плануем запрасіць 2—3 кіназорак з Індыі. Цяпер гэтым займаецца пасол Індыі ў Беларусі. У планах — прывезці на гэты фэст не менш за 500 індыйскіх турыстаў. Гэта будзе міждзяржаўны праект сумесна з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй. Пабываўшы ў Мінску, індыйскія турысты могуць пасля наведаць і гэтыя краіны.

— Ці добра ў Індыі ведаюць Беларусь?

— На маю думку, інфармацыі пра краіну ў прадстаўнікоў бізнесу недастаткова. Цікавасць да Беларусі ў індыйскіх кампаній ёсць. Але яны дрэнна знаёмыя з нацыянальным заканадаўствам, а гэта важна для рэалізацыі праектаў. Напрыклад, да мяне часта звяртаюцца па такую інфармацыю. Я тлумачу асаблівасці і ўмовы работы ў Беларусі, імкнуся да таго, каб сумесных праектаў у дзвюх краін было як мага больш.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

«Дэпутат павінен успрымаць праблемы выбаршчыкаў як свае асабістыя»

Так лічыць старшыня Мінаблсавета Наталля ЯКУБІЦКАЯ

Акрамя таго, шмат зроблена па навядзенні парадку абапал аўтадарог у ходзе падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў, па азеляненні гарадоў, пасёлкаў, вёсак. Я папрасіла старшынь сельсаветаў вызначыць у кожным населеным пункце знакавыя месцы, дзе людзі маглі б адпачыць. Такія месцы павінны быць зялёнымі, прыгожымі, з малымі архітэктурнымі формамі. Будынкі сельсаветаў — гэта таксама наш твар. І мы звяртаем увагу на іх стан, шукаем крыніцы фінансавання, для таго каб прывесці іх у належны выгляд.

> Мы не ставілі мэты выкрыць, абвінаваціць чалавека ў тым, што ён не працуе. Для камісій было прынцыпова важна працаўладкаваць яго.

— А як справы са зносам і выкарыстаннем старога і пустуючага жылля?

— Гэтая работа праводзіцца ў межах Указа Прэзідэнта № 357 «Аб пустуючых і старых дамах». Такога ў вобласці дастаткова шмат, і яго колькасць павялічваецца. Мы правялі інвентарызацыю гэтых дамоў, вызначылі іх колькасць. Цяпер фарміруем рэестр, для таго каб у далейшым звяртацца з іскавымі заявамі ў суд, і па яго рашэнні мы зможам накіроўваць бюджэтныя сродкі на знос або прадаваць з аўкцыёну тыя дамы, якія будуць карыстацца попытам. Такім чынам мы будзем прыцягваць у сельскагаспадарчы абарот нерухомасць і зямельныя ўчасткі.

— На працягу мінулага года для дэпутатаў сур'ёзным экзаменам стала выкананне Дэкрэта Прэзідэнта Беларусі № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва». Сёлета работа ў межах гэтага дакумента працягваецца?

— Летась у кожным раёне вобласці і горадзе Жодзіна былі створаны камісіі, прычым у самым шырокім складзе. Усяго іх 23. Людзі звярталіся сюды не толькі па заяўленым прынцыпе. Мы і самі іх запрашалі, прапаноўвалі работу. Мы не ставілі мэты выкрыць, абвінаваціць чалавека ў тым, што ён не працуе. Для камісій было прынцыпова важна працаўладкаваць яго. Мы папярэджвалі працаздольных не занятых у эканоміцы грамадзян, што з 1 студзеня яны будуць аплачваць сабекошт паслуг гарачага водазабеспячэння ў памеры 100 %.

Дадам, што заяўнікі звярталіся таксама і па кансультацыю па самых розных пытаннях. І яны атрымалі адказы, змаглі вырашыць шырокі спектр пытанняў, паколькі ў камісіях працавалі розныя спецыялісты. Каля 10 тысяч грамадзян камісіі змаглі ўладкаваць на працу, каля 11 тысячам аказалі кансультацыйную дапамогу.

Камісіі працягваюць работу і ў 2019 годзе. Сюды можна прыйсці і папрасіць разгледзець пытанне аб працаўладкаванні. І тут абавязкова дапамогуць усім ахвотным.

— Наталля Віктараўна, як кажуць, генерала робіць світа. Інакш без аднадумцаў цяжка дабіцца станоўчага. Вы задаволены сваёй камандай?

— Я характарызую каманду дэпутатаў як працаздольную, ініцыятыўную, мэтанакіраваную. Думаю, мы многае зможам зрабіць з цяперашнім дэпутацкім корпусам. Дзякуй усім за работу, спагаду да праблем людзей і неабыякавасць. Ну а кіраўніцтву вобласці — словы ўдзячнасці за падтрымку, разуменне, за сумесную справу.

— Якія рысы, на вашу думку, павінен мець народны выбраннік перш за ўсё?

— У першую чаргу ён павінен умець выслухаць людзей і ўспрыняць праблему свайго выбаршчыка як асабістую. Менавіта для гэтага грамадзяне даверылі нам такія пачэсныя пасады. І мы павінны апраўдаць іх давер, быць адкрытымі, адчуваць любую сітуацыю.

> Вялікую ўвагу аддаём мы стану помнікаў, брацкіх магіл, мемарыялаў, воінскіх пахаванняў. Тыя трагічныя падзеі мы не маем права забываць: неабходна помніць і ўшаноўваць памяць людзей, якія аддалі жыццё за нашу будучыню, і захаваць гэтую памяць для нашчадкаў.

Дэпутатаў сельвыканкамаў нацэльваю на тое, каб яны вызначылі пласт праблем, якія паўтараюцца, каб у далейшым выключаць іх, шукаць фінансаванне, закладваць выдаткі на іх вырашэнне ў бюджэты і тым самым выпраўляць сітуацыю. Асабіста мне падабаецца працаваць з людзьмі, не толькі выслухоўваць нейкія праблемы, але і вырашаць іх. Мяне радуе, калі ўсё складваецца і я бачу ўсмешкі жыхароў Міншчыны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ЧЫМ ЗМОЖАМ — ДАПАМОЖАМ

Звароты самай рознай тэматыкі ад жыхароў цэнтральнага рэгіёна паступаюць на прамую тэлефонную лінію, што праводзіць старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ. «МС» пацікавілася, якія пытанні пераважалі на нядаўняй сувязі.

Небяспечныя і неўладкаваныя дарогі

Кацярына Сергіевіч паскардзілася, што праз вёску Казыры Лагойскага раёна ходзяць машыны вялікай грузападымальнасці, якія возяць пясок з кар'ера на асфальтабетонны завод. Мнагатонны транспарт разбівае дарогу, стварае небяспеку для людзей. Пры гэтым кіроўцы ігнаруюць аб'язны шлях, спецыяльна для іх пабудаваны.

Наталля Якубіцкая пагадзілася, што пытанне вельмі патрабуе неадкладнага вырашэння, таму патэлефанавала старшыні Лагойскага райвыканкама і старшыні раённага Савета дэпутатаў і папрасіла пракантраляваць, каб на ўяздзе паставілі забараняльны для праезду грузавога транспарту знак.

Яшчэ адзін аналагічны званок паступіў з Лагойскага раёна ад Алены Музычэнка. Жанчына паскардзілася, што праз вёску Пархава снуюць машыны, гружаныя пяском. У выніку пастаяннай вібрацыі па сценах яе дома пайшлі трэшчыны. А аб'язной дарогі няма. Наталля Якубіцкая абяцала разабрацца ў сітуацыі.

Аляксандр Шушкевіч з Чэрвеньскага раёна прасіў пахадайнічаць перад адпаведнымі службамі, каб замянілі разбіты асфальт на асобных участках дарогі ад Старога Прудка да Раваніч.

— І колькі гэта будзе ў кіламетрах? — пацікавілася Наталля Якубіцкая.

— Недзе каля пяці, — быў адказ.

— Абнадзейваць я вас не магу. Усё залежыць ад таго, ці вызначана фінансаванне, ці закладзена неабходная сума ў бюджэце непасрэдна на рамонт менавіта гэтай дарогі. Высветлю ў раённага кіраўніцтва.

Шлях да памяці

— У 1990 гады старшыня мясцовага калгаса выдаткаваў грошы на пракладку дарогі ў вёсцы Траскаўшчына Мінскага раёна, якая вядзе да воінскага пахавання. Кожны год на Дзень Перамогі, Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тут збіраліся людзі, ветэраны, каб аддаць даніну памяці загінуўшым. Летась кацельная пачала вазіць па гэтай дарозе дровы, і яна прыйшла ў непрыдатнасць, — расказаў Аляксандр Ключнік.

Мужчына неаднаразова звяртаўся да кіраўніцтва раёна, каб адрамантавалі дарогу, апошні раз — у красавіку. Яму паабяцалі, што выканаюць просьбу. Але воз і сёння там.

Наталля Якубіцкая падзякавала Аляксандру Кузьмічу за неабыякавасць і даручыла старшыні Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юліі Бялянкінай разабрацца ў сітуацыі. Акрамя таго, паабяцала, што выедзе на месца сама.

Не дазваніцца

У вёсцы Лукашы Гаранскага сельсавета нельга дазваніцца па мабільніку — сотавая сувязь не бярэ. Дрэнна працуе яна і ў вёсцы Падневічы Валожынскага раёна. Людзі не могуць выклікаць нават хуткую дапамогу. У аграгарадку Наваполле пасля прафілактычных работ на рэтранслятары ў Калодзішчах пачаліся праблемы з каналамі тэлебачання — слабы сігнал. У вёсцы Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна, дзе ў асноўным жывуць дачнікі, з перабоямі працуе інтэрнэт. Жыхары сцвярджаюць, што для яго работы неабходна ўстанавіць узмацняльнікі, якія яны згодныя купіць за ўласны кошт. Наталля Якубіцкая паабяцала адрасаваць усе гэтыя пытанні кіраўніцтву Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам».

Нічыйны дом і абыякавы гаспадар

Надзвычай актуальнае пытанне ўзняў жыхар вуліцы Партызанскай з Барысава Ігар Уладзіміравіч. Ён пражывае ў прыватным сектары. Па адзін бок ад яго дома знаходзіцца ўчастак, які зарастае пустазеллем, — гаспадар за ім не даглядае, не абкошвае. А па другі бок — наогул нікто не жыве, гаспадарчыя пабудовы прыходзяць у заняпад, разбураецца дах. Мужчына ўжо некалькі гадоў звяртаецца да мясцовых уладаў з просьбай аддаць пустуючы ўчастак дбайным людзям, а на другім прымусіць уладальніка навесці парадак.

Наталля Якубіцкая даручыла старшыні Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пятру Навіцкаму высветліць, каму належаць участкі, і разабрацца з гэтым пытаннем.

Фота Анатоля КЛЕШНУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— А я, у сваю чаргу, вазьму сітуацыю пад асабісты кантроль, — запэўніла яна заяўніка.

Адхіліўся ад праекта

Віктар Саланевіч з вёскі Чэчына Дзяржынскага раёна на сваім зямельным участку пабудаваў летнюю кухню, але не можа ўвесці яе ў эксплуатацыю. Старшыня мясцовага сельвыканкама не падпісвае адпаведны акт. Хаця, як сцвярджае заяўнік, на будаўніцтва памяшкання ён браў дазвол, ёсць зацверджаны праект.

— Магчыма, вы адхіліліся ад праекта? — выказала меркаванне Наталля Віктараўна. — Вышыня, шырыня вытрымана?

— Там, дзе быў ухіл каля метра, я зрабіў падвал, — прызнаўся заяўнік.

Разам з тым Наталля Якубіцкая паабяцала, што накіруе зварот старшыням Дзяржынскага райсавета і Фаніпальскага сельсавета, якія разам з кампетэнтнымі службамі выедуць на месца, каб разабрацца ў сітуацыі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ІНВЕСТЫЦЫІ

Будуецца новы руднік

Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларуськалій» пачынае будаўніцтва Дарасінскага рудніка. Яго праектная магутнасць па здабычы калійнай руды складзе каля васьмі мільёнаў тон штогод з наступным павелічэннем да дзевяці мільёнаў тон.

Згодна з праектам на прамысловай пляцоўцы плануецца ўзвесці адміністрацыйна-бытавы комплекс, цэх драблення, склад руды ёмістасцю да 50 тысяч тон і іншыя вытворчыя памяшканні. Здабытая руда будзе перапрацоўвацца на сільвінітавай абагачальнай фабрыцы трэцяга рудаўпраўлення. Для яе пастаўкі пабудуюць наземную канвеерную галерэю працягласцю каля 7,2 кіламетра.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З улікам геалагічнай пабудовы гэтага ўчастка Старобінскага радовішча калійных солей на рудніку плануецца адпрацоўваць запасы солей на двух гарызонтах — трэцім і чацвёртым. Глыбіня распрацоўкі трэцяга калійнага гарызонту ад 499 да 1000 метраў, чацвёртага — ад 560 да 1000 метраў. Разліковы тэрмін службы рудніка з улікам разведаных запасаў складае не менш за 40—50 гадоў. Увод у дзеянне новай вытворчасці дазволіць стварыць дадатковыя рабочыя месцы і забяспечыць працоўную занятасць насельніцтва прамысловага рэгіёна Міншчыны.

Папаўненне рудная базы — самая важная задача цяперашняга асваення Старобінскага радовішча. З гэтай мэтай «Беларуськалій» рэалізуе маштабную інвестыцыйную праграму — будаўніцтва новых вытворчасцяў. Так, у 2009 годзе ўведзены ў эксплуатацыю Чырвонаслабадскі руднік, у 2012-м — Бярозаўскі. На завяршальным этапе рэалізацыя буйнейшага інвестпраекта — будаўніцтва Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу ў Гомельскай вобласці, які на сённяшні дзень самы перспектыўны. Яго база дазваляе істотна павялічыць вытворчыя магутнасці «Беларуськалія», выпускаць новыя віды высакаякаснай прадукцыі і паспяхова канкурыраваць на сусветным калійным рынку. На Петрыкаўскім ГАКу будуць выкарыстоўвацца самыя сучасныя тэхналогіі горназдабываючай прамысловасці, якія забяспечаць эфектыўнае выманне руды з нетраў і перадавыя спосабы яе абагачэння, як замежныя, так і беларускія. У снежні 2019 года плануецца атрымаць першыя тоны канцэнтрату. Праектная магутнасць камбіната не менш чым 1,5 мільёна тон хларыду калію ў год.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ЗАНЯТАСЦЬ

ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС ВЫБІРАЕ СМІЛАВІЧЫ

У гэтым упэўнілася карэспандэнт, наведаўшы пасёлак

Смілавіцкі сельсавет не толькі самы буйны ў Чэрвеньскім раёне, але і адзін з найбуйнейшых у Мінскай вобласці. Толькі ў гарадскім пасёлку Смілавічы пражывае 7,5 тысячы чалавек. І з кожным годам колькасць насельніцтва павялічваецца. Дэмаграфічнай сітуацыі спрыяе зручнае геаграфічнае становішча, блізкасць да Мінска. А яшчэ населены пункт параўноўваюць са спальным раёнам. Каля 50—60 працэнтаў грамадзян працуе ў Мінску, а вечарам вяртаецца дадому. Шмат жыхароў Смілавіч занятыя і ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск».

Хто хоча працаваць, той не шукае прычыну

— Калісьці на гарбарным заводзе, які быў горадаўтваральным для пасёлка, налічвалася 500 рабочых месцаў, затым іх колькасць знізілася да 300, і прадпрыемства закрылі. У выніку людзі страцілі работу. Хтосьці ўладкаваўся на аналагічную вытворчасць у Гатава. Добра, што завод дастаўляе людзей на работу і назад сваім транспартам, — расказвае **старшыня Смілавіцкага сельвыканкама Уладзімір КУЛАГІН.** — Цяпер у пасёлку няма буйных прадпрыемстваў. Засталася толькі валюшна-лямцавая фабрыка. Раней тут штат дасягаў 150 чалавек, выпускалася каля 200 тысяч пар валёнак, а таксама — якасныя, з натуральнай воўны коўдры, падушкі. Калі я працаваў на фабрыцы, то і тады кваліфікаваныя спецыялісты і рабочыя сыходзілі з-за невялікіх заробкаў. Цяпер тут становішча, скажам так, цяжкае, колькасць работнікаў скарацілася больш як напалову.

Але, па словах Уладзіміра Уладзіміравіча, сітуацыя выпраўляецца. У Смілавічы прыходзіць прыватны бізнес. Напрыклад, на базе гарбарнага завода пасля рэканструкцыі кампанія СП ТАА «Рэб-Фарма» адкрыла вытворчасць медыцынскіх прэпаратаў. Гэта сумесны турэцка-беларускі бізнес. Цяпер прадпрыемства ў стадыі станаўлення і колькасць рабочых месцаў невялікая. Але ўладальнікі абяцаюць у перспектыве стварыць іх да 300. Для Смілавіч гэта важкая падтрымка.

На тэрыторыі сельсавета наладжана таксама вытворчасць вокнаў, у вёсцы Кулікі ТАА «Легір» выпускае бытоўкі для паўночных раёнаў Расіі. Гэтыя цёплыя дыхтоўныя збудаванні прызначаны для пражывання тых, хто працуе вахтавым метадам. Яшчэ адно прадпрыемства, ТАА «Англійскі газон», вырошчвае газонную траву і рулонамі пастаўляе прадукцыю па ўсёй Беларусі. Акрамя таго, на прадпрыемстве СП ТАА «Стартфрукт» запускаецца цэх па вытворчасці сухафруктаў і перапрацоўцы ягад і пладоў на джэм і павідла, які прапаноўвае 20 новых рабочых месцаў. У вёсцы Заполле, дзе пражывае больш за 1,5 тысячы чалавек, прадпрымальнік выраблявае сучасную секцыйную сетку для агароджы, вароты. Некалькі прадпрыемстваў займаюцца дрэваапрацоўкай.

Цікавасць дзелавых людзей да Смілавіцкага сельсавета мой суразмоўнік звязвае з тым, што да сталіцы — рукой падаць: аўтобусам, маршруткай — 20—30 хвілін. Акрамя таго, у сельскай мясцовасці і малых населеных пунктах пры адкрыцці вытворчых магутнасцяў прадугледжаны шэраг ільгот з боку дзяржавы: падатковыя, мытныя, спрашчэнне адміністрацыйных працэдур. Усё гэта ў сукупнасці ўплывае на скарачэнне выдаткаў, сабекошт прадукцыі, разнявольвае ініцыятыву.

Разам з тым на тэрыторыі сельсавета знаходзіцца самадастатковы буйны сельскагаспадарчы кааператыў «Запольскае», дзе таксама патрэбны рабочыя рукі. Таму ў кожнага чалавека ёсць магчымасць рэалізаваць сябе ў любой галіне: у сельскай гаспадарцы, прамысловасці. Няхай зарплата ў Смілавічах ніжэй, чым у сталіцы, але ж для паездкі туды і назад кожны дзень неабходныя грошы на аплату дарогі, харчавання. Тое на тое і выходзіць.

— А ці шмат людзей звяртаецца па пытаннях працаўладкавання? — пацікавілася ў старшыні сельвыканкама.

— У раёне працуе камісія па садзейнічанні працоўнай занятасці. Тым, хто хоча працаваць, заўсёды знаходзім месца. Напрыклад, многіх працаўладкавалі ў «Запольскае», і кіраўніцтва імі задаволенае. Тых, хто вядзе асацыяльны лад жыцця, выклікаем на сходы, праводзім прафілактычныя гутаркі. Гэта прыносіць эфект, але не такі, як хацелася б. Разам з тым 10—15 працэнтаў бяруцца за розум і становяцца на шлях выпраўлення...

Дагнаць і перагнаць Чэрвень

Нашу размову штохвілінна перапыняюць званкі на рабочы, мабільны тэлефоны. Уладзімір Кулагін дае падначаленым дакладныя распараджэнні: куды паслаць машыну, ссыпаць пясок, скінуць будаўнічыя матэрыялы. Яго клопаты зразумелыя: у цэнтры Смілавіч ідзе маштабнае добраўпарадкаванне.

— Праз гадоў 5—6 спадзяёмся па колькасці насельніцтва абагнаць Чэрвень. Паступова наводзім парадак у пасёлку: людзі павінны жыць у камфорце і ўтульнасці, — лічыць Уладзімір Уладзіміравіч. — Нам шмат дапамагае старшыня райвыканкама Віталь Мікалаевіч Казлоў. З раённага бюджэту выдзелена каля 200 тысяч рублёў на ўладкаванне тратуарных дарожак і каля 300 тысяч рублёў на рэканструкцыю былога кінатэатра «Мара». Цяпер тут будзе Цэнтр культуры і адпачынку. На вуліцы Рэвалюцыйнай зробім тратуары. На вуліцы Максіма Горкага ўладкуем прыгожыя бардзюры, зялёныя зоны. Для добраўпарадкавання выкарыстоўваем таксама сродкі ад продажу зямельных участкаў. Дарэчы, мы жывём на свае грошы.

Актыўна ў гарадскім пасёлку вядзецца жыллёвае будаўніцтва. Сёлета закладваюцца тры шматкватэрныя дамы, налета — шэсць. Усяго ж у перспектыве плануецца пабудаваць 8—10 дамоў. У сувязі з чым чакаецца, што колькасць насельніцтва прыбавіцца недзе на дзве тысячы чалавек. Цяпер у чарзе на атрыманне зямельных участкаў для індывідуальнага будаўніцтва стаіць больш за 500 грамадзян.

— Участкі прадаём з аўкцыёнаў. Мы павінны зарабляць грошы на развіццё населенага пункта, — сказаў напрыканцы Уладзімір Кулагін.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Медыя

Новыя «стравы» ў тэлеменю

Шэсць новых замежных тэлеканалаў неўзабаве пачнуць вяшчанне ў Беларусі. Афіцыйны дазвол тэрмінам на тры гады атрымалі ў Міністэрстве інфармацыі нашай краіны праграмы «Тэра Інкогніта», «Невядомая планета», «Савецкае кіно», «HD Media», «КінаМеню HD» і «STAR cinema».

Як адзначаецца ў прэс-рэлізе Мінінфарма, згаданыя тэлеканалы «маюць забаўляльную і пазнавальную скіраванасць — сюжэты пра падарожжы, а таксама дэманстрацыя мастацкіх (ігравых) фільмаў». Пры гэтым, нагадваюць спецыялісты ведамства, наяўнасць таго ці іншага канала ў Спісе замежных СМІ, якія атрымалі дазвол на вяшчанне ў Беларусі, вызваляе ад неабходнасці атрымліваць такі дазвол іншых асоб, адказных за распаўсюджванне.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 89

З 27 красавіка па 4 мая ў п. Кранева (Балгарыя) праходзіў маладзёжны чэмпіянат Еўропы па шашках-64. Да медалёў па бліц, заваяваных у першы дзень спаборніцтваў, нашы шашысты дадалі медалі па хуткай і класічнай гульні.

У класічнай праграме чэмпіёнамі сталі Аляксандра Спірына, Міхаіл Семянюк, Яна Якубовіч, Захар Шыбакоў, Вікторыя Нікалаева, Марат Леў і Дар'я Нікіфарава. Серабро выйгралі Уладзіслаў Валюк, Сяргей Астапаў і Фелікс Баярскі, бронзу Нэлі Куртава.

У чэмпіянаце Еўропы па хуткай гульні перамаглі Аляксандра Спірына, Міхаіл Семянюк, Яна Якубовіч, Вікторыя Нікалаева, Марат Леў і Дар'я Нікіфарава. На другім месцы Захар Шыбакоў, на трэцім Уладзіслаў Валюк, Сяргей Астапаў, Інга Барашка, Фелікс Баярскі і Нэлі Куртава. Такім чынам, Яна Якубовіч, Вікторыя Нікалаева, Марат Леў і Дар'я Нікіфарава сталі абсалютнымі чэмпіёнамі Еўропы, перамогшы ва ўсіх трох праграмах.

У камандным заліку зборная Беларусі заняла першае месца. Пераможцам турніру па шашках-64 сярод ветэранаў, які праходзіў у Мінску 12 мая, стаў Аркадзь Плакхін.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым адзела.

№ 40



Белыя простыя шашкі: g1, f2, d4, b6, h6 (5).

Чорныя простыя шашкі: h2, f4, h4, f6, g7, d8, f8 (7).

№ 41

Белыя простыя шашкі: g1, f2, c5, b6, h6 (5).

Чорныя простыя шашкі: h2, f4, h4, f6, g7, d8, f8 (7).

№ 42

Белыя простыя шашкі: 18, 22, 27, 32, 33, 38, 44 (7).

Чорныя простыя шашкі: 11, 14, 16, 19, 26, 39 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 88 ад 10.05.2019.

№ 37 1. g3-f4 e3:g5 2. c1:a3 g5-f4 3. e1-d2 c3:e1 4. g1-f2 e1:g3 5. h4:f2 2-0.

№ 38 1. 24-19 13:35 2. 33:24 36:47 3. 20-15 47:20 4. 25:03 27-31 5. 03:48 35-40 6. 48-34 40:29 7. 15-10 18-22 8. 10-04 22-28 9. 04-10 28-33 10. 10-15 29-34 11. 15:38 34-40 12. 38-33 40-45 13.33-50 2-0т.

№ 39 4, 48-43, 32, 25, 18, 49-43, 38 х.

Дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны Бор Іванцэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013; e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Тэлесеткі

ГУЛЬНІ СКОНЧЫЛІСЯ

Днямі выйшла апошняя серыя самага папулярнага тэлесерыяла сучаснасці «Гульня тронаў», які ішоў на канале HBO восем гадоў. Крытыкі і публіка, зрэшты, назвалі фінальны эпізод найгоршай серыяй усёй шматгадовай сагі. Каля 10 мільёнаў амерыканцаў пасля прагляду фінальнай серыі ўзялі адгул ці бальнічны, каб перажыць расчараванне, і больш за восем мільёнаў тэлегледачоў з розных краін свету падпісалі петыцыю з патрабаваннем перазняць фінал.

Аднак вытворцы паведамілі, што не плануюць рабіць гэтага, здымаць працяг альбо перазапускаць калі-небудзь серыял з іншымі акцёрамі ці рэжысёрамі. Зрэшты, ёсць і прыемная навіна для міжнароднай фан-суполкі: ужо гэтым летам пачнуцца здымкі аднаго з трох праектаў па сусвеце «Гульні тронаў», у якім не будзе знаёмых гледачам персанажаў, але будуць пэўныя сюжэтныя хады, якія растлумачаць далейшыя падзеі.

«Гульня тронаў» — тэлевізійны серыял у жанры фэнтэзі, які здымаўся для кабельнага канала HBO паводле серыі кніг амерыканскага пісьменніка Джорджа Марціна. Прычым у апошнія некалькі сезонаў серыял нават абагнаў літаратурную першакрыніцу: два завяршальныя раманы цыкла яшчэ не апублікаваныя.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Сядзі і глядзі

«ВЕЛЬМІ ШКОДНА НЕ ЕЗДЗІЦЬ НА БАЛЬ, КАЛІ ТЫ ГЭТАГА ЗАСЛУГОЎВАЕШ»

На наступным тыдні, 29 мая, споўніцца 110 гадоў з дня нараджэння савецкай актрысы, якая нарадзілася ў Беларусі, Яніны Жэймо. Яна сыграла больш за тры дзясяткі роляў у кіно, але галоўную славу ёй прынёс фільм «Папялушка» (1947). 1 і 2 чэрвеня тэлеканал «Культура» паказа дакументальны фільм пра няпросты лёс кіналюбіцы ўсяго Савецкага Саюза, а таксама ўласна казку.

...Яніна нарадзілася ў Ваўкавыску ў цыркавой сям'і і з трох гадоў працавала на манежы — гімнасткай, наезніцай, балерынай, музычным эксцэнтрыкам. Бацька рана памёр, і маме з чатырма дочкамі давялося брацца за любую працу, каб выжыць. Іх кармі-ла эстрада: Яніна з сёстрамі прыдумалі нумар на ксілафонах. Як лічыла сама актрыса, магчыма, яна перастала расці (рост яе быў менш чым 148 см, памер нагі — 31) якраз таму, што цягала на галаве цяжкія інструменты, бо рукі хутка стамляліся. У 15 гадоў Яніна паступіла ў акцёрскую студыю Ленінградскага кінакамбіната, а ў 1925 годзе дэбютавала ў кіно. Ролі школьніц зрабілі яе настолькі папулярнай, што за Жэймо натоўпамі хадзілі прыхільнікі... Далейшую працу перапыніла вайна. Муж Жэймо, рэжысёр Іосіф Хейфіц, разам з дзецьмі выехаў у Ташкент, а Яніна засталася ў Ленінградзе. Днём яна ў складзе канцэртнай брыгады выступала ў шпіталях, гарадскіх парках, а ўначы, як і ўсе гараджане, дзяжурыла на дахах і гасіла запальныя бомбы. Толькі ў канцы 1942 года ўдалося таксама перабрацца ў Ташкент, але дома яе ніхто не чакаў: да мужа дайшлі чуткі пра яе гібель, і ён палічыў сябе свабодным чалавекам... Ад болю і крыўды актрыса цяжка захварэла, ледзь не памерла насамрэч. Выратаваў яе будучы трэці муж, польскі рэжысёр Леанід Жано, які літаральна выхадзіў Яніну, нібы дзіця.

Як згадвала потым рэжысёр фільма «Папялушка» Надзея Кашаверава, уся гэтая гісторыя з самага пачатку была прыдуманая пад Жэймо. Заяўку ўдалося «прабіць» вельмі хутка, а сцэнарый Яўгена Шварца аказаўся настолькі пераканаўчым, добрым і жыццесцвярджальным цудам, што мастацкая рада дала «добро» аднагалосна.

Цудаў падчас стварэння кінастужкі і надалей хапала. Як інакш назваць мужнасць Фаіны Ранеўскай, якая дзеля ролі «дыктатара»-мачахі штодня падцягвала каўчукавым клеем нос і падбівала ватай шчокі, ігру акцёраў, якія ў халодных павільёнах рабілі выгляд, што ім весела і душна на балі, або працу мастакоў па касцюмах, якія пашылі шыкоўныя ўборы для каралеўскага балю літаральна з нічога. У справу ішлі рэшткі аксамітных штор, абрэзкі шыфону, чэшскае насценнае бра — з яго выйшаў галаўны ўбор фея-хроснай... Нарэшце, ці не цуд, што 38-гадовая Яніна Жэймо перайграла ўсіх маладых канкурэнтак, балерын і актрыс. Дарэчы, прынц — Аляксей Кансоўскі — таксама быў не юным хлопчыкам, яму было 34 гады.

Жыхары Бараўлянскага сельсавета ў свой час сталі заложнікамі сітуацыі. У апошнія гады тут будавалася многа шматкватэрных дамоў, выдзяляліся ўчасткі для індывідуальнай забудовы. Будаўнічыя фірмы не надта імкнуліся ўзводзіць сацыяльную інфраструктуру.

У выніку ўсё гэта прывяло да недахопу месцаў у дашкольных і школьных дзіцячых установах. Цяпер тут робяцца захады да выпраўлення сітуацыі. У 2019—2020 гадах плануецца пабудаваць комплекс «Дзіцячы сад — сярэдняя школа» ў вёсцы Бараўляны ў раёне вуліцы Жамчужнай за кошт сродкаў Мінгарвыканкама, для чаго неабходна высекчы 4,8 гектара лесу. Супраць такога рашэння выступае частка жыхароў, якія стварылі ініцыятыўную групу. Яны сцвярджаюць, што на гэтым участку растуць расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу, у прыватнасці лілея кудраватая, і патрабуюць перанесці будаўніцтва на пустое поле ў вёсцы Бараўляны. Але тут прадугледжана ўзвядзенне шматкватэрных дамоў для медыкаў і настаўнікаў — на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у сельсавеце стаіць каля чатырох тысяч спецыялістаў. Як сцвярджаюць праекціроўшчыкі і будаўнікі, у Бараўлянах і аграгарадку Лясны знайсці іншыя ўчасткі для будаўніцтва дзіцячых устаноў немагчыма па прычыне шчыльнасці забудовы.

У чарговым звароце ў рэдакцыю нашай газеты заяўнікі заклапочаны, што прадпрыемства «Марэна» ўзнавіла, на іх думку, незаконныя зямельныя работы ў лесапаркавай зоне. Яны патрабуюць перанакіраваць будаўніцтва комплексу «Дзіцячы сад — сярэдняя школа» на пустыр, у чыстае поле.

— Размяшчэнне комплексу ў раёне вуліцы Жамчужнай адпавядае функцыянальнаму занаванню ўчастка, якое прадугледжана і зацверджана Генеральным планам развіцця вёскі Бараўляны і аграгарадка Лясны ў жніўні 2018 года, — адзначыла **старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ.** — Вясной на аб'екце праводзіліся інжынерна-геалагічныя разведвальныя работы, і ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя накіраваны дакументы на атрыманне дазволу на перасадку «чырванакніжнікаў».

І яшчэ адзін момант, які закранаюць заяўнікі, — нібыта работы вядуцца без узгаднення з зацікаўленымі арганізацыямі. Аднак, як запэўніла Жанна Варабей, усё ўзгоднена з адпаведнымі службамі: экалагічнымі, прыродаахоўнымі, лясгасам, ва ўстаноўленым законам парадку, з неабходнымі дазволамі. Таму падстаў для пераносу месца будаўніцтва няма.

Але кола прэтэнзій часткі грамадзян з кожным разам павялічваецца. Напрыклад, яны незадаволеныя будаўніцтвам шматфункцыянальнага гандлёвага цэнтра. На іх думку, гэта прывядзе да транспартнага калапсу.

Дарэчы, па гэтым аб'екце прайшла працэдура грамадскага абмеркавання, у Доме культуры 12 сакавіка была арганізаваная прэзентацыя праекта з удзелам забудоўшчыкаў, спецыялістаў Мінскага райвыканкама, сельвыканкама, жыхароў. Праектанты і падрадчыкі адказалі на ўсе пытанні, што цікавілі людзей.

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Знешэканомбуд», якое набыло зямельны участак з аўкцыёну, распрацавала праектна-каштарысную дакументацыю. Яна ўзгоднена з усімі службамі, у тым ліку і з дарожнай аўтаінспекцыяй рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання. Паколькі з аднаго боку аб'екта ідзе рэспубліканская аўтатраса М3 Мінск — Віцебск, з другога — абласная Н9037 Дубаўляны — Бараўляны — Каралёў Стан, для бяспекі пешаходаў і кіроўцаў на будучым аб'екце прадугледжаны заезд і выезд транспарту з розных бакоў, пешаходныя дарожкі, святлафор, больш за 200 месцаў для стаянкі транспарту. Кампанія плануе абсталяваць закрытыя комплекс або зону адпачынку для дзяцей. Акрамя таго, адкрыццё цэнтра дазволіць стварыць каля 200 новых рабочых месцаў, што будуць не лішнія для Бараўлян.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ЭКАНАМІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

НАРАЧАНСКІ КРАЙ ВАБІЦЬ ТУРЫСТАЎ

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Мядзельскі раён — гэта сапраўдная жамчужына Беларусі, можна сказаць, райскі куточак для адпачынку. Менавіта тут знаходзіцца самае вялікае возера нашай краіны — Нарач. А ўсяго іх налічваецца 51. Непадалёку ад райцэнтра каля вёскі Нікольцы паміж азёрамі Нарач і Мястра на 16 гектарах раскінуўся ўнікальны дэндралагічны сад, дзе расце 400 відаў дрэў і кустоў, характэрных для розных кліматычных зон. Тут можна наведаць і адзіны ў краіне музей лесу. Надзвычай цікавы аб'ект — Аптэкарскі сад, дзе вырошчваюць лекавыя расліны. А стварaўся ён на прыкладзе манастырскіх садоў Сярэднявечча. У фітагасцёўні варта пакаштаваць чайныя кампазіцыі на травах. Ёсць тут і хацінка бабулі-траўніцы, якая прадказвае будучыню.

Ад медыцынскага да рэлігійнага турызму

— У нас шмат унікальных прыродных комплексаў, не кранутых чалавекам: лясы, балоты, якія ўяўляюць вялікую цікавасць для эколагаў. І сама прырода Нарачанскага краю натхняе чалавека на актыўны паўнавартасны адпачынак, — лічыць **старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алег БАРОЎКА.** — Раён склаўся як курортны пачынаючы з 1960-х гадоў. У нас дзейнічаюць адзінаццаць санаторна-курортных устаноў. Летась у здраўніцах адпачылі і паправілі здароўе 78 тысяч чалавек. Сорак працэнтаў ад гэтай колькасці — іншаземцы: расіяне, літоўцы, латышы, эстонцы, украінцы. У 2018 годзе здраўніцы, аграсядзібы, гасцініцы экспартавалі паслуг на 15,1 мільёна доларaў — 120 % ад узроўню 2017-га. Так што турызм пачаў развівацца і даваць аддачу.

— Алег Алегавіч, наколькі ведаю, раней адпачывальнікі скардзіліся на нездавальняючую інфраструктуру, маўляў, недастаткова пунктаў грамадскага харчавання, не найлепшыя ўмовы пражывання. Як вырашаецца гэтая праблема?

— Што датычыцца інфраструктуры і патрабаванняў турыстаў, то на мясцовым узроўні пра іх ведалі. Апошнія гады мы былі ў фокусе пастаяннай увагі абласных улад у працэсе падрыхтоўкі да абласнога свята-фестывалю працаўнікоў сяла «Дажынкі», якое адбылося летась. Напярэдадні свята ў Мядзеле адкрыўся гасцінічны комплекс. Гэта, лічу, значны крок да вырашэння праблем, на якія наракалі турысты. Акрамя таго, па праграме развіцця Нарачанскай зоны на 2011—2015 гады ў курортным пасёлку Нарач пабудавалі гасцініцу, кожная здраўніца адкрыла па пяць гасцявых домікаў. Для санаторыяў набылі сучаснае медыцынскае абсталяванне, перш за ўсё дыягнастычнае. Так што ў раёне працуюць над паляпшэннем якасці паслуг. А да заўваг турыстаў мы прыслухоўваемся, яны падштурхоўваюць да прыняцця неабходных рашэнняў і да пазітыўных зрухаў.

Сапраўды, з кожным годам на Мядзельшчыне, адзначаюць турысты, адбываюцца перамены да лепшага, а здраўніцы аказваюць усё больш якасныя паслугі. Гэта ўплывае на прыток медыцынскіх турыстаў.

— У раёне ёсць усе падставы і для наладжвання рэлігійнага турызму, паколькі працуюць восем каталіцкіх і дзевяць праваслаўных храмаў, — адзначае Алег Бароўка. — А Будслаўскі фэст унесены ЮНЕСКА ў спіс каштоўнасцяў нематэрыяльнай спадчыны. Штогод фестываль збірае каля 30 тысяч паломнікаў.

Арганічнае земляробства ў стадыі станаўлення

— Алег Алегавіч, у раёне робяцца захады, каб наладзіць арганічнае земляробства. На мой погляд, гэта таксама можа прыцягнуць турыстаў.

— Гэтая справа пакуль у стадыі станаўлення. У вёсцы Камарова мы стварылі на базе вучылішча пляцоўку па арганічным земляробстве. Але, на жаль, навучальная ўстанова закрылася. Разам з тым работа працягваецца, перш за ўсё ў плане вызначэння стандартаў арганічнага земляробства і тэхналогій. Мы разумеем, што перад сельскай гаспадаркай раёна гэтая задача паўстане. Таму цяпер распрацоўкі ідуць на тэарэтычным узроўні. Хаця ўжо вызначаны дзве сельгасарганізацыі, якія ў перспектыве змаглі б заняцца арганічным земляробствам, пачынаючы з вырошчвання прадукцыі раслінаводства і паступова пераходзячы да вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Гэтае пытанне знаходзіцца пад кантролем Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчавання Мінаблвыканкама. Сялянская гаспадарка «Антэй-Сад» у Мядзельскім раёне ва ўрочышчы Вытраскі ўжо два гады займаецца вырошчваннем жыта і алейнай рэдзькі па тэхналогіі арганічнага земляробства. Гэтая прадукцыя можа быць запатрабаваная на рынках краін Еўрасаюза. У 2020 годзе плануецца атрымаць адпаведны сертыфікат.

— Як вы думаеце, фермеры, прыватныя прадпрыемствы будуць далучацца да ініцыятывы арганічнага земляробства больш актыўна?

— Мяркую, яны далучацца ў тым выпадку, калі мы дакладна вызначым розніцу ў цане і тое, наколькі гэта выгадна. Ужо цяпер зразумела, што кошт арганічных прадуктаў будзе вышэй, чым звычайных. Трэба разумець таксама, што арганічнае земляробства патрабуе пэўных намаганняў, затрат. І на першапачатковым этапе не заўсёды акупляецца. У раёне ўжо ёсць кампанія «Каля трох азёр», якая вырошчвае экалагічна чыстыя лекавыя расліны з далейшай перапрацоўкай на чай.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

САД З ІМЯННЫМІ ТАБЛІЧКАМІ

Штогод на пачатку ліпеня ў аграгарадку Будслаў, што на Мядзельшчыне, збіраюцца на фэст паломнікі, каб пакланіцца іконе Божай маці, якая знаходзіцца ў адным са старэйшых касцёлаў Беларусі. Будслаўскі фестываль — візітная картка Мінскай вобласці, свой адлік ён вядзе з XVII стагоддзя. Летась ЮНЕСКА ўнесла яго ў рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Вёску Палессе называюць варотамі да святыні, менавіта праз яе пралягае шлях паломнікаў, — расказвае **старшыня Будслаўскага сельскага Савета дэпутатаў Георгій ШЧАЎЛІК.** — Сёлета пра свой удзел ва ўрачыстасцях заявілі больш за трыццаць тысяч чалавек. Таму да прыёму гасцей рыхтуемся загадзя. У прыватнасці, у Палессі мяняем агароджу за кошт бюджэту. Спадзяёмся, што на дапамогу прыйдуць уласнікі домаўладанняў: з імі правялі неабходную работу. Шмат увагі аддаём навядзенню парадку, азеляненню як аграгарадка Будслаў, так і населеных пунктаў сельсавета.

Гэтай вясной у Будславе з'явіўся вішнёвы і чарэшневы сад, дзе высаджана чатырыста саджанцаў. На кожным з іх — імянная таблічка з прозвішчам таго, хто пасадзіў дрэўца.

— У пасадцы сада ўдзельнічалі жыхары аграгарадка, настаўнікі, прадстаўнікі арганізацый і ўстаноў, — кажа Георгій Уладзіміравіч. — Пладовыя дрэўцы Будславу падарыў ксёндз-пробашч Чырвонага касцёла Уладзіслаў Завальнюк, які стараецца ў нас бываць як мага часцей. Наогул мы працуем у цесным звязе з мясцовым духавенствам, настаяцелем касцёла айцом Дзмітрыем. Напрыклад, з яго ініцыятывы на беразе ракі Сэрвеч расчысцілі звалку. Добрых слоў заслугоўваюць і нашы дэпутаты.

Георгій Уладзіміравіч запрашае нас на бераг рэчкі, дзе з самага ранку шчыруе **дэпутат сельскага Савета Іван ПЯТРОЎСКІ.**

— У гэтым урочышчы мы працавалі талакой тры дні запар, — канстатуе Іван Пятроўскі. — Расчысцілі тэрыторыю ад смецця, бабаранавалі, сабралі камяні. З іх выклалі кола, такі наш будслаўскі стоўнхэндж, у сярэдзіне пасадзім дуб. Месца засеем травой. А ў перспектыве паступова будзем працягваць уладкоўваць зону адпачынку, паставім лаўкі, малыя архітэктурныя формы, альтанкі.

Яшчэ нядаўна ў гэтым урочышчы насупраць касцёла стаяў дом. З цягам часу будынак прыйшоў у нягоднасць, і яго знеслі. А вось прыгожыя туі не спілавалі. Як сапраўдныя гаспадары, што клапоцяцца пра сваю малую радзіму, перасадзілі. І яны радуюць вяскоўцаў і гасцей.

— Нашы жыхары вельмі палюбілі святы вёскі, просяць, каб праводзілі іх кожны год, карпатліва рыхтуюцца, сумесна наводзяць парадак, — расказвае Іван Пятроўскі. — Праводзім яго звычайна ў Дзень чыгуначніка на чыгуначнай станцыі Будслаў. Яна ўмоўна дзеліцца на дзве часткі: непасрэдна сама станцыя і Разарвар. Чаму назва такая дзіўная? Ды таму, што тут раней было бензасховішча — паліва захоўвалася ў рэзервуарах. Летась свята арганізоўвалі разарварцы, сёлета гасцей будуць прымаць станцыённыя. І варта сказаць, што кожны год тут нешта змяняецца да лепшага. Напрыклад, паставілі памятныя крыж, знак у гонар былой пачатковай школы, якая дала пуцёўку ў жыццё многім жыхарам.

— У вёсцы Палессе калісьці была сядзіба памешчыка Аскеркі. Там захаваўся прыгожы парк са старым кедрам. Адзін корпус сядзібы прыведзены ў парадак. Цяпер у ім месціцца амбулаторыя. А вось рэшткі тэрасы, якая злучалася з будынкам, плануем рэстаўраваць. Ды гэта справа аддаленай перспектывы, бо на аднаўленне патрэбны вялікія грошы. Шукаем іх, пралічваем розныя варыянты, — дадае Георгій Шчаўлік.

Непадалёку ад памесця знаходзіцца былы аэрадром — цяпер тут вялікі пустыр, які добраўпарадкавалі. Падчас фэсту на ім выстаўляюцца палаткі, вялікая сцэна. У асноўным тут спыняюцца на начлег людзі маладзейшага ўзросту — пяюць песні, танцуюць, смажаць шашлыкі.

Заўважу, што Будслаў — вельмі дружны аграгарадок. Усё тут робіцца вялікай талакой: жыхары, дэпутаты, святары, кіраўнікі ўстаноў, арганізацый, настаўнікі, школьнікі. Асаблівая ўвага аддаецца цэнтру горада, дзе раскінуўся прыгожы парк. Побач знаходзіцца і касцёл. Ксёндз Дзмітрый падчас службы заўсёды заклікае прыхаджан прыняць удзел у суботніках, добраўпарадкаванні. І людзі ахвотна адклікаюцца.

— У нас шмат планаў, каб зрабіць пасёлак яшчэ больш утульным і камфортным для жыцця. Хочацца, напрыклад, уладкаваць дзіцячую пляцоўку з атракцыёнамі. Вядома, для таго каб ажыццявіць усе задумы, патрэбны немалыя фінансы. Мы не спадзяёмся толькі на бюджэт. Думаем, як прыцягнуць сродкі з розных крыніц. Хочам паўдзельнічаць у праграме ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Бясспрэчна, для гэтага трэба распрацаваць цікавыя ініцыятывы, прапановы, абгрунтаваць іх і абараніць. Пры сельскім Савеце створана ініцыятыўная група, куды ўваходзяць дэпутаты, старасты, прадпрымальнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, актыўныя грамадзяне. Першыя крокі зроблены, будзем працягваць работу ў гэтым кірунку.

Спадзяюцца тут таксама зарабіць грошы на добраўпарадкаванне і ад продажу зямельных участкаў. У стадыі распрацоўкі ўжо тры ўчасткі. На вуліцы Паштовай стаіць стары дом. Як кажуць мясцовыя старажылы, гэта помнік яўрэйскага дойлідства. Яго выкупіў чалавек, хацеў рэстаўраваць, але нешта пайшло не так, і будынак хутка разбурэецца — валяцца цэгла, дах.

— Прасцей яго знесці і пабудаваць тут новы. Ёсць ахвотныя на набыццё ўчастка. Таму мы падаём дакументы ў суд на знос гэтага будынка, — сказаў напрыканцы старшыня сельвыканкама.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

САБРАЦЬ, АДСАРТАВАЦЬ, ПЕРАПРАЦАВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На першым этапе закупілі 1400 пластыкавых кантэйнераў. На кожнае домаўладальніцтва іх выдаецца па два. Шэры — для змяшаных камунальных адходаў, жоўты — для другаснай сыравіны. Пераблытаць немагчыма.

— Кожны домаўладальнік цяпер павінен сартаваць свае адходы і складаць іх у адпаведныя кантэйнеры, — расказвае **генеральны дырэктар Гомельскай гарадской ЖКГ Віктар КУЛАГА.** — У прызначаны дзень, паводле графіка руху смеццявоза, гаспадар павінен выкаціць са свайго двара патрэбны кантэйнер — каб супрацоўнікі прадпрыемства выгрузілі яго змесціва ў спецыяльны транспарт.

Дакладны графік вывазу

Кантэйнеры на колах закупілі за кошт прадпрыемства «Спецкамунтранс» і перадалі жыхарам у карыстанне. Кожны домаўладальнік атрымаў персанальны каляндар з графікам вывазу смецця ад яго дома на год наперад.

Камунальнікі сцвярджаюць, што ўжо прыкметна павялічылася дысцыплінаванасць жыхароў пры аддзяленні розных відаў адходаў. Да таго ж палепшылася эстэтыка гарадскіх вуліц. Цяпер пейзаж не псуюць цэлафанавыя мяхі, выстаўленыя проста на вуліцу. Эканамічны эфект набываецца на транспартных выдатках: павялічана ёмістасць кантэйнера для збору другасных рэсурсаў, адпаведна, стаў большым інтэрвал іх вывазу.

Калі ж жыхар нешта пераблытаў і ў кантэйнер трапіла не тое, для чаго ён прызначаны, адрас парушальніка паведамляюць дыспетчару. З домаўладальнікам будзе праведзена індывідуальная работа. Пакуль прадстаўнікі ЖКГ выхоўваюць толькі тлумачэннямі, але надалей можа быць і штраф, тлумачыць

Прадукцыя, якую робяць з перапрацаваных палімераў.

дырэктар «Спецкамунтранса» Валерый ТКАЧОЎ:

— З 1 чэрвеня мяхі ўжо не будуць прымацца да вывазу. Такія дзеянні будуць лічыцца парушэннем заканадаўства па абыходжанні з адходамі. Далей — пратакол і прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці. Кодэкс аб адміністрацыйных парушэннях нашай краіны ў гэтых выпадках прадугледжвае папярэджанне ці накладанне штрафу ад 5 да 50 базавых велічынь. На індывідуальных прадпрымальнікаў — да 200 базавых велічынь, на юрыдычную асобу — да адной тысячы базавых велічынь.

Пляцоўкі з падстрэшкам

У кварталах шматпавярховай забудовы збор адходаў ажыццяўляецца на кантэйнерных пляцоўках. Гомельскае прадпрыемства «Спецкамунтранс» пачало іх мадэрнізацыю. Працягваецца закуп новых кантэйнераў, якія зачыняюцца вечкамі, па перыметры пляцовак усталёўваецца агароджа. У асобных месцах, напрыклад на дваровай тэрыторыі вуліц Паўлава і Валгаградскай абласнога цэнтра, над пляцоўкай зрабілі падстрэшак. Цяпер звонку зона збору адходаў нагадвае альтанку. Напамін аб тым, як правільна вызначаць і сартаваць адходы, — пры ўваходзе. Між тым многія гамяльчане ўжо прызвычаіліся гэта рабіць.

З такіх пляцовак адходы вывозяць на палігон, які за пяць кіламетраў ад горада. Гомельскі займае 16 гектараў і быў пабудаваны ў 1968 годзе. Ён разлічаны на паўстагоддзя, але ж і сёння эксплуатуецца. Моцнага смуроду і людзей, якія нешта вышукваюць, тут няма. Ёсць відэакамеры, уваход па прапусках і чайкі, якія лунаюць над вялізнай гарой спрэсаванага за гады смецця і крыкамі нагадваюць пра мора.

Грунт з арганікі

Летась сюды прывезлі 200 тысяч тон камунальных адходаў. Новыя пласты па тэхналогіі перыядычна перасыпаюць грунтам. З леташняга верасня ў Гомелі яго робяць на месцы — з арганічных адходаў. Пасля гадавой перапрацоўкі бактэрыямі яны становяцца асновай для стварэння ўрадлівага перагною.

Удзельнікам семінара паказалі створаную на палігоне пляцоўку для кампаставання арганічных адходаў. Яна зроблена паводле рэкамендацый інстытута «Белкамунпраект» і ўяўляе сабою шэсць буртоў даўжынёй па 110 метраў кожны, у якія складаюць такія адходы. Праўда, патрабуецца значна больш грунту, чым сёння дазваляе выдзеленая пляцоўка.

Уладзімір Кухараў даручыў прапрацаваць пытанне выдзялення дадатковых зямель пад новую пляцоўку кампаставання адходаў. Пры гэтым размова ішла і аб выкарыстанні ўрадлівай субстанцыі для добраўпарадкавання гарадскіх тэрыторый.

Могілкі халадзільнікаў

Шэсць гадоў, як другасныя матэрыяльныя рэсурсы ў Гомелі здабываюць з агульнай масы адходаў на эксперыментальным біямеханічным заводзе. Сюды часцей паступаюць ужо падзеленыя адходы. Калі трапляе змяшанае смецце, яно апрацоўваецца ўручную. Нядаўна тут жа адкрылі пляцоўку для разборкі буйной бытавой тэхнікі. Старыя халадзільнікі і пральныя машыны на разборку ў Гомель прывозяць з трох рэгіёнаў краіны. З іх здабываюць металы і паліморы. Што рабіць з уцяпляльнікам, цяпер вырашаюць сумесна з інстытутам механікі металапалімерных сістэм.

Летась завод атрымаў на дасартаванне 34 тысячы тон цвёрдых камунальных адходаў. З іх атрымалася выняць 19,2 тысячы тон другасных матэрыяльных рэсурсаў. З пускам другой тэхналагічнай лініі, магчыма, атрымаецца і больш. Ёсць планы па паўаўтаматычных зонах сартавання і зоне для кампаставання біямасы.

Люкі, якія не скрадуць

Частка атрыманых другасных рэсурсаў прадаецца ў якасці сыравіны перапрацоўшчыкам. Другасныя палімеры выкарыстоўваюцца на ўчастку ААТ «Спецкамунтранс», які знаходзіцца асобна, па вуліцы Барыкіна. Штогод тут перапрацоўваецца 1250 тон моцна забруджаных палімераў. Іх ператвараюць у бардзюры, каналізацыйныя кольцы, калодзежы, люкі рознага прызначэння, дажджапрымальнікі, плітку для тратуараў, шлангі, мэблевую фурнітуру і нават ланцугі. Гэта прадукцыя карыстаецца попытам у арганізацый ЖКГ і будаўнікоў.

Кольцы, напрыклад, запатрабаваны пры будаўніцтве санітарных ямін. Яны лёгкія настолькі, што манціраваць можа нават адзін чалавек без спецыяльнай тэхнікі. Палімерная тратуарная плітка не прамярзае пры нізкіх тэмпературах і не лопаецца ў адлігу. Асноўныя перавагі перад аналагічнай металічнай прадукцыяй — паніжаны кошт і абарона ад крадзяжу.

Інфармаваць і растлумачваць

— Для павышэння эфектыўнасці збору другасных матэрыяльных рэсурсаў неабходны комплексны падход, — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КУХАРАЎ.** — Пачынацца ён павінен з працы з насельніцтвам. Наша задача — не толькі інфармаваць людзей, як правільна зрабіць, але і аказваць ім садзейнічанне і дапамогу, стварыць умовы для паасобнага збору і не дапушчаць вывазу на палігоны другасных матэрыяльных рэсурсаў. Гэта дазволіць другасныя матэрыяльныя рэсурсы, сабраныя ў насельніцтва, адразу накіроўваць на перапрацоўку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Могілкі халадзільнікаў і пральных машын на Гомельскім эксперыментальным біямеханічным заводзе.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, WWW.BELTORGI.BY.
Продавец: ООО «БелДрев» (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.
Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **24 июня 2019 г.** 09.00—17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Срок подачи заявок и оплаты задатка по **21 июня 2019 г.,** 17.00.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Шаг торгов / задаток, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. № 300/С-2176 (здание шликерного отделения и участка нестандартного оборудования) общей площадью 1925,5 кв. м. Капитальное строение с инв. № 350/С-143227 (водопроводная сеть). Капитальное строение с инв. № 350/С-143234 (дождевая канализационная сеть), г. Гомель, ул. Барыкина, д. 132	215 945,00	10 797,25

Вторые повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **10 июня 2019 г.** 09.00—17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Срок подачи заявок и оплаты задатка по **7 июня 2019 г.,** 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 04.04.2019 г.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Шаг торгов / задаток, бел. руб.
1	Грузовой специальный самосвал MAZ 5551-020, рег. № АЕ 3936-4, 2002 г.в., г. Гродно, ул. Карского, 2а, г. Гродно, ул. Карского, 2а	4 212,00	210,60
2	Прицеп платформа тентовая IN. PROIZV рег. № А 5673 А-4, 1995 г., г. Гродно, Озерское шоссе, 20	2 835,00	141,75
3	Грузовой седельный тягач Volvo TF 12 F рег. № АЕ 0662-4, 1989 г.в., г. Гродно, ул. Карского, 2а	2 916,00	145,80
4	Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7159 (склад культтоваров) общей площадью 982,8 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 186	189 540,00	9 477,00
5	Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7157 (склад хозтоваров) общей площадью 1212,6 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 20	288 360,00	14 418,00
6	Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7096 (склад) общей площадью 1396,3 кв. м, котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95 (инв. № 905), г. Гродно, Озерское шоссе, 20	281 394,00	14 069,70

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.
Для участия в торгах необходимо: 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY;** 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее — в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона и оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение – **Брестская обл., г. Пинск, ул. Калиновского, д. 11В**

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание лесопильного цеха	Здание специализир. для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель	2458 кв. м	130/С-40762

Составные части и принадлежности: бетонная площадка пл. 3884 кв. м, ТП пл. 48,8 м, 4 кабельные линии (50 м, 140 м, 40 м, 970 м), водопроводная сеть от здания до ВК-8; до ВК-19П (2 стальных напорных трубопровода d-100, l-3.8 м, d-150, l-601.6 м), канализационная сеть (d-150, l-123.7 м), пожарный водопровод трубопровод напорный стальной (d-350, l-692. 1 м)

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу пл. **1,2294 га** на праве аренды (срок действия по 27.12.2068) для обслуживания здания лесопильного цеха

Начальная стоимость без НДС – 174 140,00 бел. руб.

Задаток 10 % по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата, время и место проведения электронных торгов: 27.06.2019 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**. Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае непрохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: 26.06.2019 до 17.00

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91» (Продавец)

Лот № 1: UAZ 452 кузов (рама) № 390900А0206122, 1988 г. в. Начальная цена с НДС – 4 486,32 бел. руб. Задаток – 448,63 бел. руб. **Лот № 2:** автокран КС – 3577-3-1 (MAZ 5334 кузов (рама) № 120989), 1990 г. в. Начальная цена с НДС – 4 054,32 бел. руб. Задаток – 405,43 бел. руб. **Месторасположение Лотов:** г. Минск, ул. Бабушкина, 17. **Шаг аукциона** – 5 %

Аукцион состоится 12.06.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 12.06.2019 (ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91», Лот №__). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 10.06.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.03.2019

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by

10 ТЫСЯЧ ЕЎРА НА РАЗВІЦЦЁ АСАЦЫЯЦЫІ

Менавіта такі грант атрымала магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яе праект «Эфектыўнае ўзаемадзеянне. Сучаснае кіраванне. Устойлівы вынік» падтрыманы Фондам Пасольства Нідэрландаў у Варшаве (праграма MATRA). У рамках рэалізацыі праекта ў Магілёве адбыўся першы семінар з удзелам старшынь райсаветаў, прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, дэпутатаў.

Можна лічыць, што гэта першыя сур'ёзныя грошы, прыцягнутыя асацыяцыяй звонку. Дагэтуль разліковы рахунак папаўняўся выключна за кошт узносаў саміх жа дэпутатаў. Зрухі адбыліся летась, калі была ўдасканалена работа асацыяцыі, перавыбраны яе актыў, канкрэтызаваны мэты і задачы. Узначаліў утварэнне **старшыня Савета дэпутатаў Чавускага раёна Анатоль МАЦЮЛІН.** Менавіта пад яго кіраўніцтвам і распрацоўваўся праект.

— У нашым раёне ўжо быў станоўчы вопыт праектнай дзейнасці і прыцягнення сродкаў. Нашы спецыялісты дапамаглі зрабіць заяўку і накіраваць яе для ўдзелу ў конкурсе, — расказвае дэпутат. — Яшчэ ў самым пачатку, калі стварылі асацыяцыю, мы шукалі спосабы, як нам рэальна выконваць свае ўстаўныя функцыі. Адной з іх з'яўляецца забеспячэнне Саветаў метадычнай дапамогай у пытаннях мясцовага самакіравання, арганізацыя супрацоўніцтва паміж імі, павышэнне кваліфікацыі дэпутатаў і асоб, якія працуюць у мясцовых Саветах дэпутатаў, узаемадзеянне з іншымі органамі. Для выканання гэтых мэт і задач мы і шукалі крыніцы фінансавання, у тым ліку і знешнія. У рамках праекта, які быў прафінансаваны, плануем правесці навучанне маладых, толькі выбраных дэпутатаў — як узаемадзейнічаць, паводзіць сябе з людзьмі, як прыцягнуць іх да работы разам з органамі самакіравання для вырашэння канкрэтных праблем. На атрыманыя грошы набываем неабходнае абсталяванне, якое можна будзе выкарыстоўваць на выязных пасяджэннях, на сустрэчах з выбаршчыкамі. Зробім сайт асацыяцыі, які будзе рэгулярна напаўняцца цікавай інфармацыяй. Там змогуць прачытаць пра наш вопыт узаемадзеяння, супрацоўніцтва.

На першым пасяджэнні ў Магілёве былі разгледжаны пытанні існуючага заканадаўства ў сферы самакіравання, а таксама вопыт работы раёнаў па рэалізацыі праектаў мясцовага значэння з прадстаўнікамі самакіравання. У якасці лектараў у ім прымалі ўдзел прадстаўнікі нацыянальнага Цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і старшыня фонду імя Л. Сапегі Міраслаў Кобаса.

— Такія семінары з удзелам прадстаўнікоў ад кожнага з раёнаў будзем праводзіць яшчэ не раз, — кажа Анатоль Мацюлін. — У рэшце рэшт выйдзем на вывучэнне вопыту на практычных пляцоўках. Зробім такіх тры, хутчэй за ўсё яны будуць у Крычаве, Магілёве і Бабруйску, каб ахапіць усю вобласць. І паспрабуем правесці конкурс заявак. Найбольш цікавыя прафінансуем за кошт гэтага праекта. Наша задача — навучыцца разам вырашаць праблемы. Ёсць, напрыклад, ахвотныя зрабіць нешта дадатковае ў двары жылога дома, чаму б і не?! Галоўнае — навучыць актыўных людзей супрацоўнічаць з грамадскімі аб'яднаннямі, органамі ўлады, насельніцтвам. На семінары было шмат інфармацыі пра тое, як працуюць на месцах старасты органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, пра тое, што яны робяць за межамі таго фінансавання, якое ажыццяўляюць бюджэты. Ёсць добры вопыт, калі справе дапамагаюць фізічныя асобы, прадпрымальнікі, робяць за свой кошт дзіцячыя пляцоўкі, іншыя карысныя справы. Гэта добра, і асацыяцыя распрацоўвае дадатковыя ўмовы стымулявання для найбольш актыўных прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання. Збіраемся двойчы на год падводзіць вынікі на пярвічным узроўні, каб мець як найбольш станоўчага вопыту ў вырашэнні важных пытанняў.

Што датычыцца праектнай дзейнасці, то тут яшчэ ўсё наперадзе, запэўніваюць дэпутаты.

— Мы працуем у гэтым кірунку, — кажа Анатоль Мацюлін. — Зрабілі заяўку, калі здзейсніцца, раскажам якую. Наша галоўная задача — арганізаваць сумесную работу органаў самакіравання — дамавых, вулічных камітэтаў і гэтак далей — са службамі выканаўчай ўлады — ЖКГ, эколагамі, міліцыяй, ратавальнікамі і іншымі. Людзі павінны ведаць перспектыву развіцця іх раёна, мікразоны. Часам мы выходзім на абмеркаванне якой-небудзь тэмы, а ў зале няма людзей, якія глыбока ведаюць гэта пытанне. Гэта няправільна. Жыхары павінны быць у курсе ўсяго, што вакол іх адбываецца. Калі нехта збіраецца пасадзіць дрэва, ён павінен ведаць, якая перспектыва развіцця гэтай тэрыторыі, — можа, там заўтра будуць класці цеплатрасу або яшчэ нешта. Усе моманты павінны быць увязаныя. Таму працаваць трэба разам. А сустрэчы прадстаўнікоў мясцовай улады з органамі мясцовага самакіравання ў раёнах павінны быць змястоўнымі. Каб было жаданне нешта рабіць, а не даваць адпіскі.

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Грант, які атрымала асацыяцыя, будзе накіраваны на актывізацыю, павышэнне ролі дэпутатаў як аднаго з органаў самакіравання. Плануецца ў рамках рэалізацыі праекта правесці навучанне маладых, так бы мовіць, нявопытных дэпутатаў. Акрамя гэтага, народныя абраннікі рэгіёнаў змогуць прыняць удзел у распрацоўцы праграм развіцця сваіх раёнаў, каб можна было выбраць найлепшыя праекты і прафінансаваць за кошт гэтага гранту. У рамках праекта прадугледжваецца распрацоўка сайта асацыяцыі, яго напаўненне і падтрыманне ў актуальным стане. Плануецца актывізаваць работу са СМІ, распрацаваць адмысловы дзённік дэпутата. Гэта будзе так званы зводны дакумент з усёй неабходнай для народнага абранніка інфармацыяй.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Извещение

о проведении **5 июля 2019 г.** аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Знаменском сельском Совете Брестского района, Брестской области

№ лота	Местоположение и кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Начальная (стартовая) стоимость	Сумма задатка, руб.	Расходы на изготовление земельно-кадастрвой документации, регистрацию земельного участка, руб.	Целевое назначение земельного участка
1	Брестская обл., Брестский район, аг. Страдечь, ул. Александрова, 121280805101001176	0,1320	10 000	1 000	_1774__ руб. ___55_ коп. (возмещение расходов на объявления по акту выполненных работ, после размещения)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого жилого дома

Подъезд к участку осуществляется по ул. Александрова в аг. Страдечь. Имеется возможность электрификации, газификации. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться **5 июля 2019 г. в 10.00** по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (в здании сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Знаменского сельисполкома ВУ 94 АКВВ 3641 0000 00 31 8100 0000, в ф-ле № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC АК ВВВУ 21100, УНП 200036617, код платежа 4901, суммы задатка в размере 10 % от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления — **28 июня 2019 г. до 17.00. Контактные телефоны: 95-51-35, 95-51-36, 95-51-37**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 23 мая 2019 года.